Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 ЧЭРВЕНЯ 2007 г. ПЯТНІЦА

№ 115 (25980)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Банк ABN Amro (Нідэрланды) зацікаўлены ў развіцці доўгатэрміновага супрацоўніцтва з Беларуссю

Аб гэтым было заяўлена ў ходзе сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніцтвам банка ABN Amro.

Кіраўнік дзяржавы ў цэлым станоўча ацаніў работу ABN Amro ў нашай краіне, падзякаваў банку за супрацоўніцтва з Беларуссю ў час правядзення ацэнкі актываў ААТ «Белтрансгаз».

«Я маю на ўвазе той перыяд, на працягу якога мы працавалі з банкам. Ён прынёс нам значныя вынікі: мы сяму-таму навучыліся, чаго раней не ўмелі рабіць, у сім-тым пераканаліся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да члена праўлення банка. Пры гэтым Прэзідэнт асабліва падкрэсліў: «Галоўнае, што ў выніку вашай работы ў Беларусі кіраўніцтва і спецыялісты аднаго з буйнейшых банкаў у Еўропе ўбачылі сапраўдную Беларусь, яе фінансава-эканамічны патэнцыял».

«Той факт, што вы сёння ідзяце на адкрытае супрацоўніцтва з краінай, сведчыць аб тым, што ў нас не ўсё так безнадзейна, як пішуць некаторыя заходнія СМІ», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У сваю чаргу Вілка Джыскат адзначыў, што банк выбудоўвае ў Беларусі канцэпцыю супрацоўніцтва на доўгатэрміновай аснове і разлічвае на рэалізацыю некалькіх сумесных праектаў. Памер сукупных актываў банкаўскай групы ABN Amro на 1 студзеня 2007 года перавысіў 987 млрд еўра, статутны капітал — 1,9 млрд еўра. Банк мае больш як 4,6 тыс. філіялаў і даччыных банкаў у 53 краінах свету, уключаючы Расію, Казахстан, Узбекістан. Чысты прыбытак банка за 2006 года склаў 4,7 млрд еўра. Паліўна-энергетычны комплекс разглядаецца ABN Amro у якасці прыярытэтнай сферы для інвеставання.

Кар. БЕЛТА.

Беларусь і ПАР адыгрываюць актыўную ролю ў Руху недалучэння

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 чэрвеня сустрэўся са старшынёй Нацыянальнага савета правінцый парламента ПАР Мніэвам Йаганесам Махлангу.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць таго, што геаграфічна далёкая ад Беларусі Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка накіравала ў нашу краіну дэлегацыю такога высокага ўзроўню. Гэта сведчыць аб вялікай зацікаўленасці ў нарошчванні двухбаковага супрацоўніцтва ў развіцці дамоўленасцяў, дасягнутых у час сустрэчы прэзідэнтаў Беларусі і ПАР у Гаване ў час саміту Руху недалучэння ў 2006 годзе.

Абедзве краіны адыгрываюць актыўную ролю ў Руху, адзіныя ў поглядах на праблему справядлівага светаўладкавання, выступаюць за шматпалярнасць свету. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што добрыя перадумовы для гэтага дыялога былі створаны яшчэ ў часы Савецкага Саюза, калі паўднёваафрыканцы прыязджалі ў СССР вучыцца. У ПАР ёсць высокапастаўленыя чыноўнікі, якія раней атрымалі адукацыю ў нашай краіне. «Мы не можам не выкарыстоўваць гэты патэнцыял», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Міжпарламенцкае супрацоўніцтва знаходзіцца ў авангардзе беларуска-паўднёваафрыканскіх адносінаў, перакананы Аляксандр Лукашэнка. «Мы высока ацэньваем гэты візіт парламенцкай дэлегацыі ПАР», — сказаў беларускі лідар. Цяпер у Беларусі чакаюць з візітам прэзідэнта ПАР, сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што таксама вялікая дзяржаўная дэлегацыя Беларусі рыхтуецца наведаць Паўднёва-Афрыканскую Рэспубліку.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Удзельнікам міжнароднай канферэнцыі па праблемах Эканамічнага суда СНД

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Эканамічны суд СНД у інстытуцыянальных сістэмах Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Еўразійскага эканамічнага супольніцтва: праблемы і перспектывы».

«Выкарыстанне судовых механізмаў для вырашэння эканамічных спрэчак паміж краінамі — не толькі найбольш эфектыўны спосаб урэгулявання супярэчнасцяў, якія ўзнікаюць, але і патрабаванне часу. Роля і значэнне ў гэтым Эканамічнага суда СНД як міждзяржаўнага арбітра, безумоўна, унікальныя, паколькі менавіта ён сваёй дзейнасцю ў значнай меры забяспечвае аднастайнае разуменне і прымяненне права на тэрыторыі Садружнасці», — гаворыцца ў прывітанні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Кошт перапісу насельніцтва складзе $1 на аднаго чалавека

Ва ўрадзе

Перапісныя лісты падчас правядзення ў Беларусі перапісу насельніцтва ў 2009 годзе будуць на дзвюх мовах — беларускай і рускай, паведаміла намеснік міністра статыстыкі і аналізу, начальнік упраўлення перапісу насельніцтва Святлана Навасёлава, адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды». Людзі па жаданню змогуць запаўняць ліст на адной з гэтых моў.

Чарговы перапіс насельніцтва рэспублікі пройдзе 14—24 кастрычніка 2009 года, пра гэта ішла размова на першым пасяджэнні часовай рэспубліканскай камісіі садзейнічання перапісу насельніцтва пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера ўрада Андрэя Кабякова. А вось генеральная рэпетыцыя перапісу адбудзецца ўжо сёлета — з 14 па 24 кастрычніка ў Маладзечанскім раёне. На яе мэце — вызначыць «слабыя месцы» перапісных лістоў, каб у далейшым дапрацаваць іх ці ўнесці пэўныя змены па нейкіх пазіцыях.

Паводле слоў Святланы Навасёлавай, гэта дазволіць у рэшце рэшт атрымаць максімальна аб'ектыўную інфармацыю, з самым нізкім каэфіцыентам памылкі. У далейшым жа, падкрэсліў на пасяджэнні міністр статыстыкі і аналізу Уладзімір Зіноўскі, вынікі грунтоўнага даследавання будуць пакладзены ў аснову эканамічных прагнозаў развіцця краіны.

Адно з важных пытанняў будучай кампаніі — грашовыя сродкі, якія неабходна выдаткаваць на правядзенне перапісу. Нагадаем, што кошт папярэдняга перапісу насельніцтва, які праводзіўся ў 1999 годзе, склаў каля 50 цэнтаў на аднаго чалавека. У 2009 годзе, адзначыла Святлана Навасёлава, затраты ў параўнанні з мінулым даследаваннем узрастуць удвая, гэта значыць кошт складзе каля 1 долара ЗША на аднаго чалавека. Асноўная ж увага ў ходзе будучага перапісу будзе ўдзяляцца вывучэнню міграцыйных патокаў насельніцтва і занятасці насельніцтва. Між іншым, на перыяд правядзення перапісу міністэрствам на часовую працу будзе прыцягнута каля 40 тысяч перапісчыкаў.

Зараз робіцца ўсё магчымае, каб насельніцтва прыняло актыўны ўдзел у перапісе, зазначыў на пасяджэнні Уладзімір Зіноўскі. У прыватнасці, ужо да 1 красавіка будучага года неабходна ўпарадкаваць адрасную гаспадарку: удакладніць пералік і межы гарадскіх пасяленняў, упарадкаваць у іх нумарацыю кварталаў, дамоў і кватэр.

Часу, паводле слоў міністра, засталося няшмат, а работа гэта знаходзіцца не на належным узроўні. Пра што, дарэчы, сведчыць і выбарачная праверка, праведзеная органамі статыстыкі. Так, у маі—чэрвені было праведзена абследаванне 104 тысяч дамоў, з якіх на 11 тысячах (10,2 працэнта) адсутнічалі нумарныя знакі. Самыя высокія паказчыкі адсутнасці нумарных знакаў на дамах у Віцебскай вобласці — 18 працэнтаў, Гродзенскай — 13, Мінскай — 12 працэнтаў. Гэтыя хібы, зразумела, трэба будзе выправіць, каб не ўзнікала цяжкасцяў у ходзе правядзення перапісу насельніцтва ў 2009 годзе.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Для эфектыўнага выкарыстання Летняга амфітэатра ў Віцебску створаны ўсе ўмовы

Такую думку выказаў учора намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр Косінец, які праводзіў у горадзе на Дзвіне прыём грамадзян.

Сцэнічная пляцоўка ў Віцебску — гэта пляцоўка сусветнага ўзроўню. Тут устаноўлена самае сучаснае аўдыё-, відэа- і гукавое абсталяванне. Цяпер на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ідзе падрыхтоўка глядзельнай залы, сцэны.

Аляксандр Косінец адзначыў, што дзяржава зрабіла ўсё для забеспячэння Летняга амфітэатра магутнай матэрыяльна-тэхнічнай базай. «Таму ставіцца задача нават пасля завяршэння «Славянскага базару» праводзіць сольныя канцэрты, іншыя праграмы, каб Летні амфітэатр працаваў да 1 лістапада», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Вольга ДАВЫДАВА, БЕЛТА.

Шайбу, шайбу!

ЕРАМЕЕВУ СКАЗАЛІ «НЕ», МЕЗІН ЧАКАЕ

Час разгляду справы Андрэя Мезіна, які выступаў за зборную Беларусі, а зараз не хоча лічыцца легіянерам у Расіі, перанесены на 4 ліпеня.

Рашэнне было прынята з-за таго, што ў маскоўскі суд не з'явіліся істцы — адвакат варатара і прадстаўнікі магнітагорскага «Металурга», вароты якога галкіпер будзе абараняць у наступным сезоне.

Прэтэнзіі ў адрас расійскай федэрацыі хакея з'явіліся не толькі ў Мезіна, які нарадзіўся ў Чалябінску і мае расійскі пашпарт, але і яшчэ ў двух галкіпераў клубаў расійскай суперлігі — Канстанціна Сімчука і Віталя Ерамеева (выступалі адпаведна за зборныя Украіны і Казахстана). 19 чэрвеня справа Ерамеева ўжо разгледжана: вердыкт вынесены не на карысць варатара, таму маскоўскаму «Дынама» давядзецца плаціць за замежнага галкіпера 9 мільёнаў расійскіх рублёў ці адмовіцца ад яго паслуг.

Ірына ПРЫМАК.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РАСКВІТН�ЕЛА СОНЦА

Ёсць два самыя незвычайныя дні, калі з нашым нябесным святілам адбываюцца прынцыпова важныя падзеі. Зімой, у ноч з 24 на 25 снежня, заканчваецца зімовае сонцастаянне, і мы адзначаем чарговае нараджэнне — перанараджэнне Сонца. Адваротная сітуацыя адбываецца са святілам улетку.

21 чэрвеня яно дасягае свайго найвышэйшага росквіту, зафіксуе гэту сітуацыю на два дні, а пачынаючы з 23 чэрвеня паціху паварочвае на зіму, да сваёй штогадовай смерці. З даўніх часоў дні зімовага і летняга сонцастаяння, а пазней веснавога і асенняга раўнадзенстваў былі надзелены сакральным статусам і лічыліся ў свядомасці нашых продкаў тым часам, які трэба было выкарыстаць у мэтах максімальнага спрыяння свайму здароўю і гаспадарцы. Таму і з днём летняга сонцастаяння былі звязаны некаторыя прадпісанні і прыкметы.

● У гэты дзень абавязкова ішлі да дуба, каб заручыцца яго энергетычнай дапамогай. У народзе існавала павер'е: калі ў дзень летняга сонцастаяння моўчкі пацерці правай рукой кару дуба і пра сябе папрасіць яго дапамогі, то на працягу года свяшчэннае дрэва будзе «выцягваць» усе твае хваробы.

● У гэты дзень Сонца стаяла ў зеніце — найвышэйшай кропцы нябеснага руху і практычна не пакідала ценю, таму гэты дзень лічыўся найбольш спрыяльным для капання калодзежа. Пры гэтым той, хто пачынаў капаць (а гэта звычайна быў самы дужы і здаровы чалавек), павінен быў гаварыць наступныя словы: «Ідзі, вада, з ракі, ідзі, вада, з мора, і ўся ў наш калодзеж».

● Народныя лекары раілі ў гэты дзень паважацца аб сваёй долі. Для гэтага на стол трэба было пакласці чысты абрус, паставіць частаванне і запрасіць апоўначы свайго суджанага да незвычайнай сустрэчы.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ВЫХАДНЫЯ — З ДАЖДЖАМІ

Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава, 22 чэрвеня кароткачасовыя дажджы з навальніцамі чакаюцца на большай частцы тэрыторыі краіны.

Атмасферныя франты абумовяць уначы ў суботу, 23 чэрвеня, месцамі, а днём па паўднёва-заходняй частцы Беларусі кароткачасовыя дажджы. У нядзелю, 24 чэрвеня, дажджы і навальніцы чакаюцца ў многіх раёнах рэспублікі. Пры навальніцах будзе моцны парывісты вецер.

У выхадныя дні тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе 10—16 градусаў цяпла. Удзень у суботу будзе 22—28 градусаў вышэй нуля, а ў нядзелю стане крыху халадней — ад 17 да 23 градусаў, у Брэсцкай вобласці паветра прагрэецца да 25 градусаў.

Паводле папярэдніх даных сіноптыкаў, на пачатку наступнага тыдня надвор'е ў Беларусі будзе насіць няўстойлівы характар. Месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра днём складзе ад 19 да 25 градусаў цяпла, а ў аўторак, 26 чэрвеня, у самы цёплы дзень на наступным тыдні, тэмпература паветра павысіцца да 22—28 градусаў. У Брэсцкай і Гомельскай абласцях яна можа дасягнуць плюс 30 градусаў.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже обращенных в доход государства: **Лот № 1:** здание старой конторы (кирпичное), об. пл. 179 кв.м, начальная цена – 32 000 000 белорусских рублей; **Лот № 2:** здание компрессорной, 51,1 кв.м, 8 000 000 бел. руб; **Лот № 3:** склад сыпучих материалов, 529 кв.м, 72 000 000 бел. руб.; **Лот № 4:** бензосклад с емкостями, в т.ч емкости и колонки, 49,1 кв.м, 18 000 000 бел. руб. Объекты расположены по адресу: Солигорский район, г.п. Старобин, ул. Дризгаловича, 1. Размер задатка 10% от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «Белпромстройбанк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **26.07.2007** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **25.07.2007** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.

КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН (8-017) 224-61-34.

НАШ САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT .BY.

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

АБ ІЛЬГОТАХ. І НЕ ТОЛЬКІ

Пытанні сацыяльнай абароны апошнім часам сталі ці не найбольш папулярнымі. Што можа прапанаваць дзяржава ўсім тым, хто апынуўся ў цяжкай сітуацыі, магчымасці аблугоўвання на дому і перспектывы стварэння службы сядзелак, падтрымка пенсіянераў і інвалідаў, ільготы і гарантыі — усё гэта стане тэмай нашай чарговай «прамой лініі» з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валяр'яна Васільевіча КАРАЛЯ.

Такім чынам, увага! Наша «прамая лінія» адбудзецца сёння **22 чэрвеня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах: (8-017) 292-38-21 і 292-38-92.**

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.06.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 871,19
1 латвійскі лат	4 122,62
1 літоўскі літ	831,59
1 чэшская крона	100,29
1 польскі злоты	756,73
1 расійскі рубель	82,60
1 украінская грыўня	426,53

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,9692
10 UAH	51,4741
1000 BYR	12,0829
EUR	34,7676

Курс у гандлёвых кампаніях (на 21.06.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісьвецся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Телефон рэдакцыі: 209-69-01.

Каб любілі...

На Рэспубліканскім дні падпісчыка ў Брэсце яшчэ раз давялося ўпэўніцца, што ў нас ёсць чытачыпрыгожыя і сціплыя, а таксама вясёлыя, дасціпныя.

Першай у гэты дзень на галоўным паштамце падпісалася Галіна Афанасьеўна Кішко, работніца завода «Цветатрон». Яна сказала, што «Звязду» чытае ўся сям'я, але ўважліва сочыць за прадаўжэннем падпіскі яе мама. Па просьбе маці дачка і прыйшла на пошту. Прыемна было ўбачыць і даўнюю сяброўку газеты Святлану Мікалаеўну Ярмалюк. Святлана Мікалаеўна размаўляе на чыстай беларускай мове. І сказала пра газету так хораша: «Чытаюць людзі шмат якіх выданняў, нямала ў нас добрых, патрэбных газет. Але каб любілі, дык, мусіць, толькі «Звязду».

А прыхільніца нашых конкурсаў вершаваных радкоў і прыпевак Таццяна Фірсава нават сваю прыпеўку экспромтам склала, так бы мовіць, з нагоды:

Ціскай ты мяне, не ціскай —
Я ахоплена падпіскай.
Цябе сёння не чакаю —
«Звязду» вечарам чытаю.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Векапомнае

СА «ЗБРОЯЙ ПЕРАМОГІ» — ДА «СЦЕН РЭЙХСТАГА»

Здымак 1.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З кожным годам усё менш застаецца ветэранаў-франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў — тых, хто са зброяй у руках здабыў для нас Перамогу. Адпаведна, усё менш шанцаў для нашчадкаў пачуць з першых вуснаў, што гэта была за зброя, супраць чаго і каго яна была павернутая. Мастацкія кінастужкі пра вайну не могуць быць памочнікамі ў гэтай справе для маладога пакалення, паколькі па шэрагу прычын скажаюць гістарычныя нюансы. Тыповы штамп у іх: немцы ўжо з першых дзён вайны ў масавым парадку ўзброеныя аўтаматамі, як прынята гаварыць, «шмайсерамі». Насамрэч нямецкая пяхотная дывізія (а гэта больш за 10 тысяч чалавек) узору пачатку Вялікай Айчыннай вайны мела на ўзбраенні ўсяго 312 адзінак аўтаматычнай зброі, прычым яе насілі экіпажы бронемашын, мінамётныя і артылерыйскія разлікі, зрэдку — камандзіры ўзводаў. Астатнія карысталіся вінтоўкамі і карабінамі, якіх па штату налічвалася 12 609 адзінак. Ды і не аўтамат гэта (у ім выкарыстоўваецца прамежкавы — паміж вінтовачным і пісталетным — патрон), а пісталет-кулямёт Фольмера МР-40 (Хуга Шмайсер стварыў знешне падобны пісталет-кулямёт, але з драўляным прыкладам). Дзе людзі, якія цікавяцца гісторыяй, маглі пра гэта даведацца? Цяпер жа і пачуць, і пабачыць многае на свае вочы можна ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе ўпершыню разгарнулася і працуе ўнікальная спецыялізаваная комплексная выстаўка «Зброя Перамогі».

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ЧАТЫРЫ ГАДЗІНЫ РАНІЦЫ Ў БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ

Кожны год а чацвёртай гадзіне раніцы братаўчане і госці горада прыходзяць у Брэсцкую крэпасць, каб успомніць раніцу 41-га.

...У перадранішнім змроку мацней пахне скошаная трава, чутно ваду ў Мухаўцы і Бугу, словы гучаць цішэй. Тут і без мітынгу, без прамоў побач з руінамі крэпасці, яе мурамі ахоплівае асаблівае адчуванне — адчуванне вайны. Пра гэта гавораць нават дзеці, якія першы раз ступаюць на зямлю крэпасці.

Вось і сёлета цягнік Памяці прывёз з Масквы ветэранаў, прадстаўнікоў дзіцячага руху сталіцы — усяго каля 500 чалавек. Госці разам з брастаўчанамі адзначаць Дзень усенароднай памяці ахвяраў Вялікай Айчыннай вайны. Мітынг па традыцыі завяршаецца апусканнем у ваду Буга вянкоў з міргаючымі лампадкамі. У Свята-Мікалаеўскім саборы крэпасці праходзіць набажэнства і людзі ставяць свечкі.

Яна СВЕТАВА.

УВАГА: ПРАМАЯ ЛІНІЯ

КАБ НЕ «СЦІСКАЛА» НІ СПІНУ, НІ ГАЛАВУ

Галаўныя болі, галавакружэнні, прафілактыка і лячэнне інсультаў, болі ў пазваночніку — аб гэтым можна распытаць падчас чарговай медыцынскай «прамой лініі» загадчыцу неўралагічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі, галоўнага пазаштатнага неўролага Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ганну Віктараўну АСТАПЕНКА. «Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **26 чэрвеня з 15.00 да 16.30 па нумарах: (8-017) 292 38 21 і 292 38 92.** Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: **(8-017) 287 18 29 (Святлане Барысенка) і 287 18 36 (Вользе Шаўко).**

Добриневский сельский исполнительный комитет (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже здания школы (общ. пл. 971, 8 кв.м), расположенного по адресу: Дзержинский р-н, д. Добринево. Площадь зем. уч. 1,4351 га. Начальная цена лота – 147 150 000 бел. руб. Задаток в размере 5% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 24.07.2007г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 23.07.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактный телефон (8017) 2246134.

Сайт в Интернете: www.rlt.by.

ISSN 1990 - 763X

07115>

9771990763008

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БЕЛАРУСКІ ДАЙВЕР ТРАПІЎ У СЕТКІ Ў КРЫМЕ

Жыхар Бабруйска, які прыехаў адпачываць у Крым, заблытаўся ў моры ў сетках, якія пакінулі браканьеры, як паведамляюць электронныя СМІ.

Беларуса вызвалілі мясцовыя выратавальнікі, якія непадалёк адпрацоўвалі трэніровачныя пагружэнні і бачылі, як мужчына ў дайверскай экіпіроўцы ўвайшоў у ваду. Заўважыўшы, што буй, па якім вызначаецца рух вадалаза, застыў за 300 метраў ад берага, выратавальнікі вырашылі, што турысту патрабуецца дапамога. Яны вызвалілі яго з сетак і дапамаглі дабрацца да берага.

ЕЎРАПЕЙЦАЎ ПАЛОХАЮЦЬ АМЕРЫКАНЦЫ

Паводле даных сацыёлагаў з групы Harris Interactive, 46 працэнтаў іспанцаў, 32 працэнты немцаў, 31 працэнт французаў, 30 працэнтаў англічан і 21 працэнт італьянцаў упэўнены, што галоўнай пагрозай міжнароднай стабільнасці з'яўляюцца ЗША.

Цікава, што так думаюць і 11 працэнтаў амерыканцаў. На другім месцы па небяспецы ідзе Кітай, далей краіны, якія распрацоўваюць ядзерную зброю, — Іран — трэці, Ірак — чацвёрты, Паўночная Карэя пятая. Шостае месца ў гэтым рэйтынгу займае Расія, якую апасаюцца галоўным чынам у Германіі, Вялікабрытаніі, Францыі і Італіі.

ТРЭЦІ — НЕ ЛІШНІ

Амерыканскае камандаванне накіравала да берагоў Ірана ўжо трэцюю ўдарную групу на чале з буйнейшым авіяносцам ВМС ЗША — «Энтэрпрайз».

У яго суправаджэнні будуць таксама тры ракетныя эсмінцы, крэйсер, атамная падводная лодка і карабель забеспячэння. Гэты авіяносец будзе ўжо трэцім у рэгіёне Персідскага заліва. Ваенныя тлумачаць нарошчванне прысутнасці кантынгенту неабходнасцю процідзейнічаць магчымай дэстабілізацыі рэгіёна пасля падзей у сектары Газа, дзе да ўлады прыйшлі радыкальныя ісламісты.

СТУДЭНТ ЗЛАВІЎ «ХАЛЯВУ» Ў 500 ТЫСЯЧ

Студэнт Мардоўскага дзяржуніверсітэта атрымаў у банку не 50, а 500 тысяч рублёў. Першапачатковую суму яму выслалі бацькі, а канчатковая атрымалася ў выніку памылкі кантралёра, які ў ордэры надрукаваў лішні нуль.

Малады чалавек, студэнт 4-га курса юрыдычнага факультэта, не стаў узнімаць шум, а забраў грошы і пайшоў. Супрацоўнікі банка знайшлі, куды накіраваліся страчаныя 450 тысяч, але шукалі хлопца тры дні. Калі знайшлі, ён сказаў, што ўсе грошы патраціў і аддаў даўгі за брата. Мясцовая пракуратура заявіла, што ва ўзбуджэнні крымінальнай справы банку адмоўлена, бо студэнт грошы не краў. Між тым, кіраўніцтва банка лічыць, што малады чалавек з братам не патрацілі грошы, а схавалі.

32 ПЕНАЛЬЦІ Ў ПАЎФІНАЛЕ

У Нідэрландах на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы (ігракі ва ўзросце не больш за 21 год) у паўфінальнай сустрэчы Галандыя—Англія ўдзельнік галоўнага паядынку вызначаўся ў серыі пенальці, бо ў дадатковы час на табло была нічыя — 1:1. Зборныя выканалі па 16 адзінаццаціметровых, прычым шэсць футбалістаў падыходзілі да «кропкі» па два разы. У выніку перамаглі гаспадары — 13:12. За чэмпіёнства галандцы будуць змагацца з сербамі, якія выйгралі ў паўфінале ў бельгійцаў — 2:0.

Юрый ШАЎЦОЎ:

«Галоўны праект па супрацоўніцтву з Украінай — пастаўкі вялікіх аб'ёмаў нафты на Мазырскі НПЗ»

Пра апошнія падзеі на паліўна-энергетычным рынку Беларусі карэспандэнт «Звязды» гутарыць з беларускім палітолагам Юрыем ШАЎЦОВЫМ:

— У бліжэйшы час у Беларусі павінна быць адчынена прадстаўніцтва кампаніі «Нафтагаз Украіны». Ужо прызначаны кіраўнік гэтага прадстаўніцтва. Паводле яго слоў, адным з накірункаў працы паміж украінскай кампаніяй і беларускім бокам мог бы стаць сумесны ўдзел у распрацоўцы нафтавага радовішча ў Іране. Як вы ацэньваеце магчымасць такога супрацоўніцтва? У якіх яшчэ сферах магло б ажыццяўляцца супрацоўніцтва Беларусі з украінскім нафтагазавым манапалістам?

— Мне падаецца, што супрацоўніцтва з Украінай па ажыццяўленню праектаў у краінах «трэцяга свету» было б прадуктыўным. Бо Беларуская нафтавая кампанія, якая ствараецца зараз і якая павінна будзе працаваць у «трэцім свеце», яшчэ новая і вельмі нявопытная ў гэтых справах і ёй, безумоўна, патрэбны партнёры і можа нават інвестары.

Прынамсі, у выпадку з Іранам нашай дзейнасці па распрацоўцы там радовішча будзе дапамагаць расійска-в'етнамская кампанія. Калі там з'явіцца яшчэ адзін партнёр, украінскі, напэўна, гэты праект будзе ісці лягчэй. Тым больш, што нафта з Ірана, хутчэй за ўсё, будзе пастаўляцца ў Беларусь праз Украіну. І ўкраінскі манапаліст не будзе залішнім у гэтым праекце.

Што датычыцца іншых праектаў, то Украіна мае вопыт распрацоўкі радовішчаў вуглевадародаў у «трэцім свеце». Калі гэта будзе выгадным Беларусі, то такі вопыт залішнім не будзе. І ў выпадку з іншымі, апроч Ірана, краінамі застаецца праблема дастаўкі вуглевадародаў у Беларусь. Праз тэрыторыю Украіны гэта будзе выгадна, калі радовішчы будуць недзе на поўдні.

Галоўны ж праект па супрацоўніцтву паміж Беларуссю і Украінай у вуглевадародным сектары, гэта, напэўна, пастаўкі вялікіх аб'ёмаў нафты праз Украіну на Мазырскі НПЗ. Паводле інфармацыі, якая з'яўлялася ў СМІ, перамовы вядуцца пра пастаўку праз Украіну да 10 млн тон нафты на Мазырскі НПЗ і пра пастаўкі прадукту нафтаперапрацоўчыя заводы і быў вялікі дэфіцыт нафтапрадуктаў. Тады Мазырскі НПЗ дапамог Украіне вырашыць у цэнтральных раёнах шматлікія праблемы з дэфіцытам.

Калі ж сённяшні праект сапраўды выйдзе на такія велізарныя аб'ёмы, як 10 млн тон, то гэта магчыма толькі пры супрацоўніцтве паміж Беларуссю і ўкраінскім нафтавым манапалістам, пра якога вы кажаце. Але каб выйсці на такія аб'ёмы, трэба вырашыць шмат тэхнічных і іншых праблем. Так, неабходна завяршыць рэканструкцыю аднаго з нафтаправодаў паміж Бродамі і Мазыром, каб можна было праз Броды атрымліваць вялікія аб'ёмы нафты. Бо сёння па чыгунцы 10 млн тон перавезці нерэальна.

— Беларускія НПЗ сёння маюць патрэбу ў інвестыцыях для мадэрнізацыі, каб павялічыць глыбіню перапрацоўкі нафты і такім чынам захаваць канкурэнтаздольнасць на еўрапейскім рынку. Якую ролю ў гэтым працэсе могуць адыграць украінскія інвестыцыі?

— Гэта пытанне пра ход перамоў паміж бакамі, які мы ведаць амаль не можам. Мы можам толькі меркаваць па інфармацыі ў СМІ, пра што можа ісці размова. Калі размова ідзе пра перапрацоўку 10 млн тон нафты, якая паступіць на Мазырскі НПЗ праз Украіну і потым вернецца ў выглядзе нафтапрадуктаў ва Украіну, то, напэўна, тут не абыдзецца без украінскіх інвестыцый у наш завод. Але гэта могуць быць грошы не самой Украіны, а нейкіх іншых партнёраў.

— Апошнім часам аналітыкі гавораць пра магчымае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Казахстанам у сферы пастаўкі сыравіны. Наколькі магчыма пастаўка нафты з Казахстана ў нашу краіну?

— Гэта непазбежна. У Казахстане вельмі хутка растуць аб'ёмы здабычы і экспарту нафты. Ужо праз 3—4 гады Казахстан будзе накіроўваць на экспарт у Еўропу да 100 млн тон нафты ў год. Гэта складзе каля трэці агульнага экспарту нафты з былога Савецкага Саюза ў Еўрасаюз. А тая структура нафтаправодаў, якая існуе сёння, створана так, што нягледзячы на развіццё расійскіх нафтавых партоў у раёне Санкт-Пецярбурга, беларускі накірунак усё роўна застаецца важным. Таму казахстанская нафта наўрад ці нас абміне.

Пры гэтым казахстанская нафта з'яўляецца адносна таннай. Прынамсі, яна танней за расійскую. Таму Расіі самой часта больш выгадна накіроўваць сваю нафту праз, напрыклад, Санкт-Пецярбург, а прапампоўваць па ўнутраных магістралях (дзе вялікія кошты на транзіт) да Беларусі казахстанскую нафту.

Да таго ж нафта, якая можа прыйсці да нас праз Украіну, мінуючы Расію, хутчэй за ўсё, будзе з рэгіёна Каспійскага мора. Што гэта будзе за нафта, азербайджанская ці казахстанская, зараз сказаць складана. Хутчэй за ўсё казахстанская нафта там будзе.

— Наколькі верагодна, што будзе працаваць формула, згодна з якой Казахстан будзе пастаўляць нафту Расіі, а Расія ў залік будзе пастаўляць нафту Беларусі?

— На пачатковай стадыі гэта формула можа быць адной з самых галоўных. Бо тыя аб'ёмы нафты, якія Казахстан павінен накіраваць у Еўропу, расійская сістэма нафтаправодаў, якія ідуць у бок Казахстана, яшчэ не можа прапусціць. Таму гэта вельмі верагодная схема. І яна працуе па туркменскаму газу з Украінай. Яна можа з намі і па казахстанскай нафце спрацаваць.

— Як вы ацэньваеце ідэю стварэння Беларускай нафтавай кампаніі, якая павінна пачаць працу ў бліжэйшы час?

— Выдатна ацэньваю. Мы ўжо маем вопыт стварэння аналагічнай кампаніі ў калійнай сферы. Беларуская калійная кампанія даказала сваю вельмі высокую эфектыўнасць. Апафеозам можна лічыць кантракт, які днямі быў падпісаны з В'етнамам, аб тым, што мы будзем пастаўляць калійныя ўгнаенні коштам прыкладна 300 долараў за тону. Гэта недзе ў два разы даражэй, чым угнаенні, якія мы зараз пастаўляем у Кітай пасля таго, як дамагліся ад яго згоды на павышэнне коштаў.

Беларускую нафтавую кампанію павінен стварыць той жа чалавек, які стварыў Беларускую калійную кампанію. Гэта першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. Ён ведае, што робіць. І раз яму ўдалася БКК, мне падаецца, што і БНК таксама ўдасца. Тым больш што ў нас няма іншага выйсця. Для таго, каб Беларусі нарошчваць актыўнасць па-за межамі краіны, трэба акумуляваць свае магчымасці (іх у нас не так шмат, мы — невялікая краіна). І павінна ўтварыцца нейкая гаспадарчая адзінка, якая будзе працаваць на нафтавым рынку па-за межамі Беларусі.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
(о проекте строительства жилого дома № 4 по г/п в границах улиц Янковского—Горецкого—Проектируемая)

Информация о застройщике: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник—четверг — 8.30—17.30, пятница — 8.30—16.15, обед — 12.45—13.30.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 1 кор. 1 по ул. Одинцова	13. Жилой дом № 88А по ул. Рафиева
2. Жилой дом № 1 кор. 2 по ул. Одинцова	14. Жилой дом № 79 по ул. Есенина
3. Жилой дом № 3 кор. 1 по ул. Одинцова	15. Жилой дом № 19 по ул. Голубева
4. Жилой дом № 3 кор. 2 по ул. Одинцова	16. Жилой дом № 21 по ул. Голубева
5. Жилой дом № 95 по ул. Старовиленской	17. Жилой дом № 123А по пр. Рокоссовского
6. Жилой дом № 46 по ул. Плеханова	18. Жилой дом № 123Б по пр. Рокоссовского
7. Жилой дом № 14 по ул. Алибегова	19. Жилой дом № 39 по ул. Гурского
8. Жилой дом № 53 по ул. Шаранговича	20. Жилой дом № 31 кор. 1 по ул. Лещинского
9. Жилой дом № 55 по ул. Шаранговича	21. Жилой дом № 31 кор. 2 по ул. Лещинского
10. Жилой дом № 57 по ул. Шаранговича	22. Жилой дом № 31 кор. 3 по ул. Лещинского
11. Жилой дом № 16 по ул. Алибегова	23. Жилой дом № 64 по ул. Червякова
12. Жилой дом № 10 по ул. Алибегова	

Лицензия № 02250/0124979 на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей», выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь на основании решения № 49 от 28.02.2005 г. и действительна до 28.02.2010 г.

Информация о проекте строительства:

1. Цель проекта — строительство многоквартирного жилого дома для работников ОАО «МАПИД», нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Начало строительства — 2-й квартал 2007 г., окончание строительства — 4-й квартал 2007 г.

Положительные заключения государственной экспертизы № 139-5/07 от 17.01.2007 г., № 544-5/07 от 05.03.2007 г., государственной экологической экспертизы № 345 от 24.10.2005 г.

2. Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома — г. Минск, жилая застройка квартала с объектами культурно-бытового назначения в границах улиц Янковского—Горецкого—Проектируемая, жилой дом № 4 по генплану.

Характеристика объекта.

Объект — 140-квартирный, 9-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-464-9-УІ с помещением товарищества собственников.

Стены: наружные — железобетонные панели, внутренние — железобетонные панели.

Перегородки — железобетонные.

Перекрытия — железобетонные.

Крыша — мягкая рулонная.

Полы — линолеум, плитка.

Проемы: оконные — деревянные, дверные — щитовые.

Отопление — центральное.

Электроснабжение — скрытая проводка.

Наличие лоджий, водопровода, канализации, горячего водоснабжения, ванны и душа, электроплиты, радио, телевидения, мусоропровода, лифта — есть.

Цены на объекты долевого строительства

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства — 1330200 руб.

3. Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 816 от 27 апреля 2006 г. Собственник земельного участка — ОАО «МАПИД» (свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 12 июня 2006 г. № 500/116-1609). Границы участка проходят по улицам Янковского—Горецкого—Проектируемой, его площадь — 17,6516 га. Благоустройство — согласно проектной документации.

4. Количество квартир в доме — 140.

5. Нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества, нет.

6. Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

Помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

7. Предполагаемый ввод в эксплуатацию — 4 квартал 2007 г.

8. Строительство дома осуществляется застройщиком собственными силами без заключения договоров подряда, для состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий работников ОАО «МАПИД», на основании решений Мингорисполкома № 1902 от 14 сентября 2006 г. и № 1166 от 24 мая 2007 г.

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по строительству можно узнать по телефонам отдела инвестиций ОАО «МАПИД»: 207-19-15, 207-14-77, 207-16-73, 208-58-12.

Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося 48 дзён

ДРУЖБА... НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Са «Звяздой» я сябрую з маленства: у 1944/45 навучальным годзе вучыўся ў чацвёртым класе. Есці не было чаго, абуць, апрануць, а ўжо чытанак — і пагатоў. Выручалі беларускамоўныя газеты. З іх мы рыхтавалі тэксты, бралі вершы для завучвання на памяць.

«Звязду» наша сям'я выпісвала яшчэ да вайны. Летам 1944-га падпіска была адноўлена. З гэтага часу і на ўсё жыццё газета стала маёй «чытанкай».

Сённяшняя «Звязда» падкупляе сваёй усёабдымнасцю — ад праблем дзяржаўных, да, так бы мовіць, кухонных. Вельмі цікавыя і патрэбныя рубрыкі ствараюць самі чытачы. Але самая галоўная заслуга «Звязды» перад народам — гэта яе высакароднае змаганне за ўмацаванне прэстыжу роднай мовы.

З цікавасцю прыглядаюся да яе, звяздоўскай — даходлівай, лаканічнай, празрыстай, аўтарскай «Простай...» і веру, што яна будзе жыць вечна. А значыць не загінем і мы — як нацыя, як народ. Карацей...

Цябе, юбілярку, «Звязду» дарагую,
Любіміцу горада й вёскі,
Я — шчыры чытач твой — сардэчна віншую:
З прыгожым такім — 90!
Паклон за паклонам табе адбіваю
Падзяку сваю адрасую,
Што словам бацькоўскім душу саграваеш,
Што дбаеш пра долю людскую.
Што ў гэтым ідэйным бязладдзі сучасным
Духоўнасць народа гартуеш,
Што родную мову ад смерці заўчаснай
Як родную маці ратуеш...
То спору ж і ладу! Задумак багата —
І ззяння на радасць краіне!
Як прыйдзе «Звязда»... Ды ў кожную хату
Тады — Беларусь не загіне.
Чытач і газета — магутная сіла:
Усё мы адолець сумеем,
Каб нашая мова для ўсіх стала мілай!
Са святам, «Звязда»! З юбілеем!

Мікола ТОНКАВІЧ, *г. Мінск.*

«Белая Русь» у Мінску

Сёння ў сталіцы праходзіць устаноўчы сход Мінскага гарадскога грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

Напярэдадні ўстаноўчага сходу яго ініцыятары звярнуліся да жыхароў горада з заклікам «аб'яднаць намаганні для падтрымкі курса, які праводзіць дзяржава, для абароны нашых грамадзян ад разбуральнага ўздзеяння «добразычліўцаў звонку», спалучэння вопыту і ведаў старэйшага пакалення, сілы і магчымасцяў маладога». «Стварыўшы Мінскае грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», мы яшчэ больш аб'яднаем нашы магчымасці і памкненні да абароны нашай Радзімы, да яе развіцця, умацавання і ўдасканальвання».

Сярод ініцыятараў стварэння арганізацыі — вядучы тэлепраграм АНТ Аляксандр Аверкаў, намеснік генеральнага дырэктара РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» Юрый Арыхоўскі, заслужаны артыст Беларусі Аляксей Ісаеў, аўтар тэксту гімна Беларусі Уладзімір Карызна, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ірына Аляксанава, трохразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў Аляксандр Мядзведзь і іншыя.

Кар. «Звязды».

На слыху

Аўтамабільны ліміт

Не вельмі прыемная навіна, для фізічных асобаў, якія займаюцца ўвозам аўтамабіляў без афармлення прадпрымальніцкай дзейнасці.

Паводле звестак агенцтва ПРАЙМ—ТАСС рыхтуецца праект прэзідэнцкага ўказа, згодна з якім «незарэгістраваным перагоншчыкам» будзе дазволена ўвезці з-за мяжы па даверанасці толькі адзін аўтамабіль у год. Зараз такіх абмежаванняў не існуе. Таму фізічныя асобы актыўна навадняюць беларускі рынак іншаматркамі. Як сведчыць мытная статыстыка, напрыклад, за перыяд са студзеня па красавік, з 56,6 тысячы аўтамабіляў, увезеных у нашу краіну, доля індывідуальных перагоншчыкаў складае 45,6 тысячы. Спецыялісты падлічылі, што фізічныя асобы займаюць амаль увесь сегмент рынку патрыманых машын і прыкладна 80 працэнтаў агульнага імпарту аўтамабіляў у Беларусь. Такую актыўнасць можна было б цалкам вітаць, калі б усе перагоншчыкі, зарэгістраваліся і плацілі падаткі. Тым больш што падобны аўтабізнэс прыносіць неблагі прыбытак. Напрыклад, агульны кошт аўтамабіляў, увезеных за першыя чатыры месяцы гэтага года фізічнымі асобамі, склаў 197,5 мільёна долараў. У паведамленні ПРАЙМ—ТАСС адзначаецца, што ўвядзенне абмежаванняў для ўвозу аўтамабіляў па даверанасці прымусіць многіх перагоншчыкаў легалізавацца і дзяліцца сваімі прыбыткамі з дзяржаўнай скарбонкай. Ці апраўдаюцца гэтыя спадзяванні: пажывём — пабачым. Не выключана, што нелегальныя «аўтабізнэсмены» знойдуць магчымасць аб'ехаць і гэты бар'ер на сваім шляху.

Зрэшты, пакуль дакладна невядома, ці будуць уведзены памянёныя абмежаванні для ўвозу аўтамабіляў па даверанасці. Прынамсі, у Дзяржаўным мытным камітэце «Звяздзе» паведамілі, што не валодаюць інфармацыяй аб магчымым змяненні парадку ўвозу транспартных сродкаў фізічнымі асобамі і ўвогуле ўстрымліваюцца ад каментарыяў на гэты конт.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Векапомнае

СА «ЗБРОЯЙ ПЕРАМОГІ» — ДА «СЦЕН РЭЙХСТАГА»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Здымак 2.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Унікальнасць яе ў тым, што шырокаму колу наведвальнікаў прадстаўлена звыш 100 адзінак халоднай і агнястрэльнай зброі, што была на ўзбраенні Чырвонай Арміі (СССР), вермахта (Германія), трафейнай зброі еўрапейскай вытворчасці, калекцыя самаробнай партызанскай зброі — усё, што да нядаўняга часу захоўвалася ў запасніках музея і што маглі бачыць толькі яго работнікі. Экспазіцыя мае чатыры раздзелы.

У першым прадстаўлена зброя Чырвонай Арміі савецкай вытворчасці. Напрыклад, рэвальвер сістэмы «Наган» узору 1895 года і аўтаматычны пісталет Токарава («ТТ») узору 1933 года — зброя камандзіраў і камісараў. Дарэчы, за страту табельнай зброі пагражаў трыбунал, але частымі былі выпадкі, калі камандзіры здавалі на склад той жа «ТТ» і ваявалі з трафейнымі «Парабелумамі», «Вальтэрамі» і інш. Тут жа знаходзіцца ўнікальны экспанат — доследны ўзор 1941 года пісталета сістэмы Ваяводзіна ***(гл. здымак 2)***.

— Гэты аўтаматычны 18-зарадны пісталет з двухрадным размяшчэннем патронаў у магазіне павінен быў прыйсці на змену «Нагану» і «ТТ», але перашкодзіла вайна, — расказвае аўтар навуковай канцэпцыі выстаўкі, навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела фондавай работы музея Сяргей Лапароў. — Было выраблена толькі крыху больш за 1000 адзінак такой зброі. На сённяшні дзень экспануюцца толькі тры пісталеты сістэмы Ваяводзіна: у Маскве, Санкт-Пецярбургу і ў нас. Гэты экзэмпляр быў падораны начальніку Цэнтральнага штаба партызанскага руху П.К. Панамарэнку.

Стальны шлем узору 1936 года (так званая «халхінголка») з характэрнымі «вушамі» па баках — першы ўзор пасля грамадзянскай вайны. Паводле легенды, сам славуты маршал С.М. Будзённы правяраў яго на трываласць шашкай («вушы» якраз і прызначаны для таго, каб удары саслізвалі). Але баявыя дзеянні паказалі недасканаласць стальнога шлема.

Аснова ўзбраення радавога саставу Чырвонай Арміі — вінтоўка сістэмы Мосіна ўзору 1891/1930 гадоў — надзейная, якасная зброя. Праўда, былі і недахопы, у прыватнасці, страляць яна магла толькі з прымкнёным штыком. Павялічаная такім чынам вага і даўжыня вінтоўкі перашкаджалі бою ў замкнёнай прасторы. Даволі рэдкі, цікавы экспанат — самазарадная вінтоўка Токарава («СВТ») узору 1940 года. Чырвоная Армія была адной з нямногіх, дзе яна перад вайной знаходзілася на масавым узбраенні (Германія здолела зрабіць падобнае толькі ў 1941 годзе). У руках снайпераў СВТ была надзвычай грознай зброяй, а вось у руках байцоў, якія не ўмелі з ёй як след абыходзіцца, самазарадная вінтоўка даволі часта выходзіла са строю.

На думку вядучых спецыялістаў-збройнікаў, як савецкіх, так і замежных, пісталет-кулямёт Судаева ўзору 1943 года быў адным з лепшых пісталетаў-кулямётаў Другой сусветнай вайны. Асабліва незаменным ён быў ва ўмовах гарадскога бою. Тут жа ў экспазіцыі прадстаўлена даволі рэдкая рэч — глушыцель гуку выстралу. Яго мелі на ўзбраенні разведчыкі, спецгрупы НКУС, якія закідваліся ў тыл ворага, выкарыстоўвалі яго і партызаны.

Адным з самых любімых і масавых у Чырвонай Арміі быў добра вядомы па фільмах пра вайну, кінахроніцы пісталет-кулямёт Шпагіна ўзору 1941 года. «ППШ» быў простым і надзейным, «працаваў» пры тэмпературах ад -35°С да + 40°С. Адзінае, пры стральбе доўгімі чэргамі дыскавы магазін на 71 патрон магло пераклініць, таму з 1943 года яго замянялі ражковым 35-зарадным.

Адна з рэліквій музея — танкавы кулямёт сістэмы Дзегцярова, які быў зняты з аднаго з танкаў, што вялі бой за вызваленне Мінска ў ліпені 1944 года. Не менш цікавая легенда звязана з авіяцыйным скарастрэльным кулямётам Шпітальнага-Камарыцкага (ШКАС) узору 1934 года. Гэта быў першы ў свеце спецыялізаваны кулямёт для авіяцыі, самым дасканалым ён заставаўся да сярэдзіны Другой сусветнай вайны. Гавораць, што калі ў канцы вайны савецкія байцы трапілі ў кабінет Гітлера, у адным з куткоў пад шкляной вітрынай яны ўбачылі ШКАС. Быццам бы Гітлер, калі ён упершыню азнаёміўся з характарыстыкамі авіяцыйнага кулямёта, заявіў канструктарам і ваенным: гэты ШКАС будзе стаяць у маім кабінеце да той пары, пакуль вы не створыце хоць бы яго падабенства. Там ён і заставаўся да мая 1945-га...

Другі раздзел выстаўкі прысвечаны самаробнай партызанскай зброі. Такой унікальнай калекцыі няма больш нідзе ў свеце. «Звязда» адной з першых рэспубліканскіх газет пісала пра яе ў нумары за 12 мая 2006 года. Нагадаем толькі, што пабачыць тут можна шэраг узораў самаробнай зброі (наступальныя гранаты, аднаразрадны партызанскі пісталет, вяршыню збройнага майстэрства — самаробны партызанскі пісталет-кулямёт канструктара Далганава ўзору 1943 года, пісталет-кулямёт схаванага нашэння канструкцыі Сяргеева і інш.).

Трэці раздзел выстаўкі — нямецкая зброя. Усе прадстаўленыя ўзоры былі захоплены партызанамі і выкарыстоўваліся супраць сваіх ранейшых гаспадароў. У гэтым раздзеле паказаны практычна ўвесь спектр стралковага ўзбраення германскай арміі — ад асноўных вінтоўкі і карабіна сістэмы Маузера адпаведна ўзораў 1898 і 1935 гадоў да шматлікіх пісталетаў розных сістэм і таго самага МР-40 канструктара Фольмера, які першапачаткова задумваўся для ўзбраення парашутыстаў, экіпажаў танкаў, артылерыйскіх разлікаў. У экспазіцыі выстаўлены шэраг сістэм ручных і станкавых нямецкіх кулямётаў, прычым, пачынаючы з перыяду Першай сусветнай вайны (ва ўмовах недахопу ўзбраення немцам давялося выкарыстоўваць і такую зброю). Тут жа прадстаўлена халодная зброя, напрыклад, нож радавога саставу германскага Чырвонага Крыжа, у якога спілаваны кончык, каб нельга было выкарыстоўваць у якасці баявой зброі. Колькі слоў пра экспанат, які многім кінецца ў вочы сваім нібы сучасным абліччам. Гэта вельмі рэдкая рэч — штурмавая вінтоўка Шмайсера ўзору 1944 года. Па сутнасці, першы ў свеце масавы аўтамат. Знешне ён вельмі падобны на славуты аўтамат Калашнікава ўзору 1947 года, што ў далейшым дало многім падставы сцвярджаць, быццам Калашнікаў у многім скапіраваў штурмавую вінтоўку.

Нарэшце, апошні, чацвёрты, раздзел — зброя вытворчасці еўрапейскіх краін: Чэхаславакіі, Польшчы, Італіі, Бельгіі, Францыі і інш. Тут прадстаўлены станкавыя і ручныя кулямёты, пісталеты-кулямёты, вінтоўкі, пісталеты... Некаторыя з гэтых краін ваявалі на баку Германіі, у іншых выпадках немцы, захапіўшы тую ці іншую дзяржаву, выкарыстоўвалі ў сваёй арміі трафейную зброю. Сярод самых цікавых экспанатаў гэтага раздзела хацелася б адзначыць сапраўдны рарытэт — 20-міліметровую швейцарскую зенітку, захопленую партызанамі ў 1944 годзе (***гл. здымак 1 на першай стар.)***). Народным мсціўцам тады дасталіся дзве такія зеніткі, яны ўдзельнічалі ў партызанскім парадзе і адна з іх зараз знаходзіцца ў музеі, займаючы на выставе «Зброя Перамогі» цэнтральнае месца (другая знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу).

— Уласна самой зброяй канцэпцыя выстаўкі не абмяжоўваецца, — гаворыць Сяргей Лапароў. — Паглядзіце, праз усю залу на падлозе пралягае незвычайны дыван з геаграфічных і ваенных карт часоў вайны, фотаздымкаў розных ваенных гадоў. Шлях пачынаецца ад беларускіх гарадоў (Мінска, Слуцка, Гродна) і заканчваецца ўяўным Берлінам, сцяной рэйхстага. На гэтым фотапано на аснове рэальных здымкаў, закрытым пластыкам, любы наведвальнік можа распісацца спецыяльным маркерам. Прайшоўшы па «дывану» з умоўнай назвай «Дарога Перамогі» ад Беларусі да Германскай сталіцы, напісаць: «Мы дайшлі!» — як некалі рабілі нашы дзяды-вызваліцелі, сфатаграфавацца на гэтым фоне.

Усяго такіх інтэрактыўных частак на выстаўцы чатыры. Акрамя «Дарогі Перамогі», гэта камандны пункт Чырвонай Арміі з устаноўленым у баявой байніцы станкавым кулямётам Максім узору 1910/1930 гадоў (куды можна зайсці, «націснуць» на гашэтку кулямёта); памянёная ўжо швейцарская зенітка, на якую таксама можна прысесці і пакруціць махавікі вертыкальнай і гарызантальнай наводкі; і камп'ютар — своеасаблівы інфацэнтр, скарыстаўшы базу якога, кожны жадаючы наведвальнік можа атрымаць дадатковую падрабязную інфармацыю амаль пра любы выстаўлены экспанат і канструктараў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

З жыцця кантрабандыстаў

«СКУРЫЛІ» АЎТАМАБІЛІ

Трое грамадзян Польшчы, якія спрабавалі незаконна вывезці з Беларусі партыі цыгарэт, страцілі не толькі кантрабандны тавар, але і транспартныя сродкі.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржкамітэта пагранічных войскаў Беларусі, у пункце пропуску «Брузгі» гродзенскія памежнікі затрымалі адразу двух «тытунёвых» кантрабандыстаў з Польшчы. Абодва пераабсталявалі ў патаемныя сховішчы для цыгарэт запасныя колы сваіх аўтамабіляў. Нейкім чынам кантрабандысты здолелі «ўтрамбаваць» у запаскі партыі цыгарэт на агульную суму больш за 3 мільёны рублёў. Тытунёвыя вырабы і сродкі іх перамяшчэння — аўтамабілі «Форд» і «Мерседэс» — паводле беларускага заканадаўства будуць канфіскаваны ў даход дзяржавы.

Яшчэ адзін польскі ўмелец, які выязджаў з тэрыторыі Беларусі ў Літву, прыхаваў у бензабаку аўтамабіля «Аўдзі» 34 блокі цыгарэт. У пункце пропуску «Прывалка» беларускія памежнікі затрымалі кантрабандыста. Яму таксама давядзецца развітацца са сваім «жалезным канём», коштам прыкладна 5 мільёнаў рублёў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Крымінал

ЦЯПЕР СЯДЗЯЦЬ САМІ

Судом Аршанскага раёна і Оршы прыгавораны да пазбаўлення волі два супрацоўнікі аршанскай папраўчай калоніі № 8. Яны падазраваліся ў тым, што выкарыстоўваючы службовыя паўнамоцтвы, вымагалі грошы ў асуджаных і членаў іх сем'яў за афармленне дакументаў для ўмоўна-датэрміновага вызвалення. За што і былі затрыманы аператыўнай групай упраўлення. Выкарыстоўвалі цэлую «схему» атрымання хабару: грашовыя пераводы і паштовыя бандэролі афармляліся на падстаўных асобаў.

Як паведамляе прэс-група УКДБ па Віцебскай вобласці, начальнік атрада, старшы лейтэнант унутранай службы прыгавораны да 6 гадоў і 1 месяца пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з выкананнем адміністрацыйна-распарадчых функцый, — тэрмінам на 2 гады, а яго калега — начальнік атрада, маёр унутранай службы — атрымаў 6 гадоў і 6 месяцаў ізаляцыі ад грамадства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УО «Могилевский государственный библиотечный техникум имени А.С. Пушкина»

ДНЕВНОЕ ОТДЕЛЕНИЕ

Специальности:

- ***«БИБЛИОТЕКОВЕДЕНИЕ И БИБЛИОГРАФИЯ»***
- ***«ДОКУМЕНТАЦИОННОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ УПРАВЛЕНИЯ И АРХИВОВЕДЕНИЕ»*** (на платной основе)

Абитуриенты сдают два вступительных испытания: по белорусскому и русскому языку (по выбору) в форме ЦТ и по истории Беларуси (устно).

Проведение вступительных испытаний на дневную форму обучения получения образования на основе общего среднего образования осуществляется с 14 по 16 августа.

Срок обучения: 1 год 10 месяцев.

ЗАОЧНОЕ ОТДЕЛЕНИЕ

Специальность:

- ***«БИБЛИОТЕКОВЕДЕНИЕ И БИБЛИОГРАФИЯ»***

Прием абитуриентов на заочное отделение осуществляется без вступительных экзаменов по конкурсу среднего балла документа об образовании, в котором отметки не ниже 3 (трех) баллов.

Срок обучения: 2 года 6 месяцев

Сроки приема документов:
(дневная, заочная)

— на все формы получения образования по всем специальностям на основе общего среднего образования с 1 июля по 13 августа;

— от абитуриентов, которые выдержали вступительные испытания, но не прошли по конкурсу на получение образования за счет средств бюджета на обучение на условиях оплаты — с 18 по 19 августа.

Приоритет на зачисление имеют абитуриенты с договорами на целевую подготовку.

НАШ АДРЕС: 212022 г. Могилев, ул. Космонавтов, 7.
Тел. приемной комиссии:
31-22-00, 31-22-02. Факс: 28-37-23

Прамая лінія

ШТРАФУЕ СУД. АЛЕ НЕ КІРАЎНІК

Працоўны час і ўмовы працы, звальненні і дысцыплінарная адказнасць, водпускі і кантракты — на гэтыя і іншыя пытанні нашых чытачоў адказваюць дырэктар Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Анатоль Пятровіч САДАЎНІЧЫ, намеснік начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння і кантролю дэпартамента Вадзім Якаўлевіч БРАТАШ, а таксама начальнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення дэпартамента Аляксей Іванавіч КНЯЗІЎ.

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 20 і 21 чэрвеня).

☎ — Хутка дзіцяці споўніцца 2 гады, пасля чаго маю намер вярнуцца на работу. Ці павінны мяне прыняць з улікам таго, што на маім месцы зараз працуе іншы чалавек?

Галіна Рыгораўна

— На час водпуску па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў за жанчынай захоўваецца яе ранейшае працоўнае месца. І ў выпадку, калі такая жанчына вырашае перапыніць водпуск па догляду, гэта можна зрабіць у любы дзень — дастаткова толькі папярэдне падаць пісьмовую заяву. Таму калі наймальнік прымае на месца «дэкрэтніцы» іншага чалавека, то з ім заключаецца часовы працоўны дагавор, што ў сваю чаргу павінен скасоўвацца за дзень да выхаду асноўнага работніка — жанчыны, якая знаходзілася ў водпуску па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

☎ — Наколькі я ведаю, у сувязі з пераводам на кантракт аклад можа павышацца напалову. Чаму ж у такім разе ў мяне гэта павышэнне аказалася такім маленькім — усяго 1 працэнт?

Святлана Барысаўна Малахоўская

— Сапраўды, згодна з Дэкрэтам № 29 ад 26 ліпеня 1999 года, пры пераводзе работніка на кантракт яму павінны прадастаўляцца наступныя стымулы: дадатковы водпуск працягласцю да 5 каляндарных дзён і павышэнне тарыфнай стаўкі да 50 працэнтаў. Разам з тым трэба заўважыць, што гэта — максімальная «планка». Што да «планкі» мінімальнай, то яе па сутнасці няма. Таму, з улікам фінансавых магчымасцяў канкрэтнай арганізацыі, аклад можа павялічвацца і на 1, і нават на 0,1 працэнта. І гэта не з'яўляецца парушэннем Дэкрэта.

☎ — Колькі гадзін дазваляецца гандляваць на рынку пры высокай ці наадварот — нізкай тэмпературы паветра?

Ірына Мікалаеўна, *г. Магілёў*

— Працягласць знаходжання на працоўных месцах на адкрытым паветры па-за вытворчымі памяшканнямі санітарнымі правіламі і нормамі не рэгулюецца. Што да месцаў у вытворчых памяшканнях, то тут з мэтай абароны ад перагравання ці пераахалоджвання час работы абмежаваны велічынямі, вызначанымі СанПіНам 9-80 РБ 98. Да слова, у д

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

22
ЧЭРВЕНЯ
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 26 (15477)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

АДПАЧЫНАК У СТЫЛІ ХАКІ

Фота БЕЛТА.

У час школьных канікулаў актуальна пытанне, куды адправіць дзяцей адпачыць на лета. Кожная сям'я мае свой варыянт — да бабулі і дзядулі, у замежную вандроўку і г. д. Дзе адпачываць дачцэ, у сям'і Стэфановіч з Жодзіна, вырашаць не трэба, бо 15-гадовая Іра сама вырашыла, як бавіць вольны ад заняткаў у школе час: другое лета запар дзяўчына адпраўляецца ў спартыўна-патрыятычны лагер «Вектар», што размяшчаецца на базе 72-га гвардзейскага Аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў.

— Першапачаткова гэты лагер быў створаны для «цяжкіх» 12—16 гадовых падлеткаў, каб сваю энергію яны накіроўвалі не на разбурэнне, а на карысць калектыву. У школе многіх з іх ужо «спісалі», а мы прадастаўляем ім шанц, — кажа Ігар Лазараў, начальнік цэнтра патрыятычнага выхавання «Вектар». — Былі выпадкі, калі самыя цяжкія падлеткі, якія б'юцца ў школе, крыўдзяць іншых, у лагеры пасля рытуалу клятвы курсанта ператвараліся ў сапраўдных памочнікаў, напрыклад, у час марш-кідкоў цягнулі на сабе слабых. Наш лагер карысны для моладзі дапрызыўнога ўзросту, — лічыць Ігар Аляксеевіч, — пасля знаёмства з асновамі армейскай службы ў «Вектары» юнакі ўжо не баяцца цяжкасцяў армейскіх будняў, бо разумеюць, што такое ваенны абавязак. У прыватнасці, мой сын Аляксандр калісьці адпачываў у нашым лагеры, а зараз ужо сяржант.

Зараз у «Вектар» сталі прыязджаць не толькі тыя, хто стаіць на ўліку па справах непаўналетніх, але і іншыя юнакі і дзяўчаты, каму неабыякава ваенная гісторыя сваёй краіны, цікава пераадольваць палосы перашкод, хадзіць у паходы. Зразумела, не ўсе могуць акліматызавацца ў калектыве, асабліва разбэшчаныя, хатнія дзеці. Для такіх Ігар Лазараў спецыяльна ўвёў традыцыю: штодня дзяжурны па роце выносіць званочак і кажа, каб той, хто стаміўся ў лагеры, хоча дадому, пазваніў у званочак і тады падлетка адправяць да родных. «Гэты прыём дазваляе зразумець, хто на што варты, — тлумачыць Ігар Аляксеевіч. — Нехта праявіць слабасць і пазвоніць (такіх у першую змену было толькі два чалавекі, прычым адзін перадумаў і застаўся ў лагеры), а большасць не жадае аказацца слабым звяном і такім чынам гартуе свой характар».

— Я ніколі не хацела пазваніць у гэты званочак. Бацькі думалі, што я ў лагеры нават два дні не прабуду, — расказвае Іра Стэфановіч, — але мне настолькі тут спадабалася, што я б зноў прыехала б сюды.

Наогул мару звязаць сваё жыццё з арміяй. У мяне і тата, і старэйшы брат служылі. Буду паступаць у школу прапаршчыкаў. Дысцыпліна ў лагеры зрабіла мяне больш адказнай і навучыла пераадольваць сябе. Напрыклад, у мяне доўга не атрымлівалася навучыцца разбіраць і збіраць зброю, але я шмат трэніравалася і ўжо раблю гэта не горш за юнакоў.

Акрамя «Вектара», у Аб'яднаным вучэбным цэнтры дзейнічаюць яшчэ тры лагеры — «Абаронца Айчыны» для школьнікаў з Барысаўскага раёна, «Патрыёт» для падлеткаў са Смалявіцкага раёна і спартыўна-патрыятычны лагер для вучняў СШ № 62 г. Мінска. Штогод у іх могуць адпачыць звыш 500 чалавек. Наогул сёлета арганізавана звыш 170 спартыўна-патрыятычных лагераў. Запатрабаванасць ёсць: колькасць заяў ад устаноў адукацыі ў параўнанні з 2006-м павялічылася ў тры разы. Летась жа дзейнічала 159 спартыўна-патрыятычных лагераў, у якіх адпачыла больш як 12 тысяч падлеткаў.

Ірына ПРЫМАК.
Барысаўскі раён.

Фота Таццяны СТАНКЕВІЧ.

Пытальнік

ПАСПЯХОВАЯ ВУЧОБА ЎЗНАГАРОДЖВАЕЦЦА СКІДКАМІ

Мой сын, які атрымлівае вышэйшую адукацыю на платнай аснове, вельмі добра здаў і зімовую, і летнюю сесіі. Хацелася б даведацца, ці можа наша сям'я разлічваць на нейкія скідкі пры аплаце за вучобу? І які памер прадастаўляемых скідак? Летась, наколькі нам вядома, быў прыняты нейкі дакумент, у якім усе гэтыя пытанні былі падрабязна прапісаныя, але мы знайсці патрэбную нам інфармацыю, на жаль, не змаглі...

Т.М. РЫХЛІК, *г. Лагойск.*

Дакументаў на самай справе было два: гэта Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых пытаннях платнага навучання ў дзяржаўных установах, што забяспечваюць атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі» і Пастанова Савета Міністраў, якая зацвердзіла парадак прадастаўлення скідак са сфарміраванага кошту навучання, іх памеры, а таксама адзіны для ўсіх дзяржаўных ВНУ і ССНУ, незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці, парадак пераводу студэнтаў і навучэнцаў з платнай на бюджэтную форму навучання.

У кола асобаў, якім могуць прадастаўляцца скідкі са сфарміраванага кошту навучання, увайшлі: студэнты і навучэнцы, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай рабоце; дзеці з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў; дзеці-сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў; маладыя людзі, якія падчас свайго навучання (ва ўзросце ад 18 да 23 гадоў), страцілі апошняга са сваіх бацькоў; інваліды I, II і III груп і дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў; асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых на Чарнобыльскай АЭС»; дзеці ваеннаслужачых, работнікаў органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і органаў фінансавых расследаванняў, якія загінулі ці сталі інвалідамі пры выкананні службовых абавязкаў.

Для таго, каб прэтэндаваць на атрыманне скідак, трэба правучыцца сама меней адзін год, паколькі толькі пасля гэтага камісія зможа ацаніць дасягненні студэнта ці навучэнца. Для прыкладу, для таго, каб адпавядаць тэрміну «высокія паказчыкі ў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці», студэнт ці навучэнец павінен мець па выніках навучальнага года не менш за 50 працэнтаў адзнак «дзесяць» і «дзевяць» балаў, а астатнія адзнакі павінны быць у яго не ніжэй «шасці» балаў.

Высокімі паказчыкамі ў навукова-даследчай дзейнасці з'яўляюцца: выкананне заданняў, лабараторных работ, курсавых і дыпломных праектаў, якія змяшчаюць элементы навуковых даследаванняў, удзел у рабоце студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, гурткоў, канструктарскіх, праектных, эканамічных, навукова-інфармацыйных бюро, самастойныя навуковыя і тэарэтычныя даследаванні, наяўнасць навуковых публікацый. А пад высокімі паказчыкамі грамадскай работы маюцца на ўвазе ўдзел у рабоце органаў самакіравання, маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў, у арганізацыі і правядзенні грамадсказначных мерапрыемстваў, шэфства над ветэранамі вайны і працы, удзел у спартыўных спаборніцтвах, выставах, шэфства над цяжкімі падлеткамі, заняткі мастацкай і тэхнічнай творчасцю, удзел у валанцёрскім, будатрадаўскім руху і грамадска карыснай працы.

Канкрэтны памер скідак студэнтам і навучэнцам, якія дасягнулі высокіх вынікаў у вучэбна-пазнавальнай, навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай рабоце, залежыць ад сярэдняга бала паспяховасці па выніках за папярэдні навучальны год і не можа перавышаць 60 працэнтаў ад сфарміраванага кошту навучання. Сярэдні бал разлічваецца як сярэднеарыфметычная велічыня з адзнак, атрыманых за навучальны год па выніках здачы экзаменаў, дыферэнцыраваных залікаў, курсавых работ і праектаў, усіх відаў практыкі, прадугледжаных вучэбным планам, адзнак па не вынесеных на экзаменацыйную сесію дысцыплінах з улікам акруглення да дзесятых. Пры сярэднім бале паспяховасці 9,0 памер скідкі будзе складаць 60 працэнтаў ад сфарміраванага кошту навучання, ад 8,25 да 9,0 — 40 працэнтаў, ад 7,46 да 8,25 — 20 працэнтаў.

Студэнтам і навучэнцам, якія прэтэндуюць на скідкі, так бы мовіць, па сацыяльных крытэрыях (сіроты, інваліды і г.д.), скідкі прадастаўляюцца пры ўмове атрымання па ўсіх прадметах адзнак не ніжэй «шасці» балаў, уключаючы вынікі здачы экзаменаў, залікаў, курсавых работ, праектаў, усіх відаў практыкі і дысцыплін, не вынесеных на экзаменацыйную сесію. Скідкі для гэтай катэгорыі студэнтаў і навучэнцаў складаюць 40 працэнтаў ад сфарміраванага кошту навучання.

Студэнты і навучэнцы, якія прэтэндуюць на атрыманне скідак у наступным навучальным годзе, павінны падаць пісьмовую заяву ў камісію да 20 жніўня. На падставе пададзеных заяў на працягу пяці дзён складаюцца адпаведныя спісы. Камісія абавязана прыняць рашэнне аб прадастаўленні скідак студэнтам не пазней за *1 верасня. Майце на ўвазе, што ўсе скідкі прадастаўляюцца тэрмінам на адзін навучальны год.* Студэнты і навучэнцы, якія маюць запазычанасці, прэтэндаваць на льготу не могуць. Камісія можа таксама пазбавіць студэнта і навучэнца скідкі ў выпадку атрымання ім нездавальняючых адзнак у час экзаменацыйнай сесіі або парушэння правілаў унутранага распарадку і грамадскага парадку.

КРЭДЫТ НА НАВУЧАННЕ — ЯК ВЫРАТАВАЛЬНАЯ САЛОМІНКА

Падкажыце, калі ласка, хто і на якіх умовах можа атрымаць у «Беларусбанку» льготны крэдыт на навучанне. У нашай сям'і — двое дзяцей-студэнтаў. Старэйшы навучаецца на «бюджэце», а малодшы — на платнай форме навучання. Фінансавае становішча сям'і апошнім часам пагоршылася, таму і з'явіліся пэўныя праблемы з аплатай вучобы. Магчыма, выратаваннем для нас стане льготны крэдыт ?

М.Ц. КІРЫЛЬЧЫК, *г. Баранавічы.*

Прэтэндаваць на атрыманне ў ААБ «Беларусбанк» льготнага крэдыту могуць асобы, якія атрымліваюць першую вышэйшую адукацыю на дзённай форме навучання ў дзяржаўных ВНУ, а таксама ў вышэйшых навучальных установах спажывецкай кааперацыі і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Ільготны крэдыт можа прадастаўляцца як непасрэдна навучэнцу, так і аднаму з яго бацькоў ці законнаму прадстаўніку пры наяўнасці ў іх пастаяннай крыніцы даходаў.

Сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і за папярэдні год не павінен перавышаць 350 працэнтаў зацверджанага бюджэту пражыткovага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, які дзейнічае на дату адкрыцця крэдытнай лініі. Крэдытатрымальнік з больш высокімі даходамі не зможа разлічваць на атрыманне ў банку льготнага крэдыту.

Крэдытная лінія адкрываецца або ў аддзяленні банка па месцы знаходжання навучальнай установы, або па месцы пастаяннага жыхарства крэдытаатрымальніка. Крэдыт выдаецца часткамі на працягу ўсяго перыяду навучання, прычым максімальны памер сумы кожнай часткі крэдыту не можа перавышаць 70 працэнтаў гадавога кошту навучання. Астатнія 30 працэнтаў ад кошту навучання студэнт ці яго бацькі ўносяць самастойна. На рукі крэдытаатрымальнік грошы не атрымлівае — сродкі пералічваюцца ААБ «Беларусбанк» у беларускіх рублях на рахунак навучальнай установы ў адпаведнасці з тэрмінамі, указанымі ў дагаворы на падрыхтоўку спецыяліста.

У дзень выдачы першай часткі крэдыту банк накіроўвае па месцы вучобы крэдытаатрымальніка паведамленне аб адкрыцці крэдытнай лініі.

Вяртанне крэдыту пачынаецца з наступнага месяца пасля заканчэння навучальнай установы. На вяртанне крэдыту адводзіцца пяцігадовы тэрмін з моманту атрымання дыплома. Аднак яшчэ на працягу навучання крэдытаатрымальнік павінен штомесячна выплачваць банку працэнты за карыстанне крэдытам — плата за карыстанне крэдытам складае 50 працэнтаў стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Пагашэнне працэнтаў ажыццяўляецца з наступнага месяца пасля атрымання крэдыту за фактычны час карыстання.

У выпадку адлічэння з навучальнай установы студэнта, які вучыцца на платнай аснове, прадастаўленне яму акадэмічнага водпуску, пераводу з платнай формы на навучанне за кошт бюджэтных сродкаў, альбо пераводу студэнта на завочную і вячэрнюю формы навучання, навучальная ўстанова на працягу трох дзён з дня выдання загаду накіроўвае ў банк паведамленне аб даце адлічэння, прадастаўлення акадэмічнага водпуску або пераводзе.

Крэдытныя сродкі, нявыкарыстаныя для навучання, навучальная ўстанова вяртае банку ў дзесяцідзённы тэрмін. У выпадку адлічэння студэнта з навучальнай установы, крэдытаатрымальнік абавязаны датэрмінова (на працягу не больш як 12 месяцаў з даты адлічэння) вярнуць банку атрыманы крэдыт з выплатай працэнтаў за карыстанне ім у памеры стаўкі рэфінансавання Нацбанка, якая дзейнічае на дату адлічэння, за ўвесь перыяд карыстання гэтым крэдытам.

У выпадку невыканання ўзятых абавязацельстваў па вяртанню крэдыту і выплаце працэнтаў за карыстанне крэдытам, крэдытаатрымальнік выплачвае банку за кожны пратэрмінаваны дзень павышаныя працэнты ў памеры двухразавай стаўкі рэфінансавання, якая будзе дзейнічаць на дату стварэння пратэрмінаванай запазычанасці.

Пры прадастаўленні студэнту акадэмічнага водпуску, пераводзе яго на завочную (вячэрнюю) форму навучання або з платнай формы навучання на навучанне за кошт бюджэтных сродкаў крэдытаатрымальнік вяртае банку атрыманы крэдыт на працягу пяці гадоў, пачынаючы з наступнага месяца пасля заканчэння навучальнай установы з выплатай працэнтаў за карыстанне ім у памеры 50 працэнтаў стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПОЛЬСКІЯ АЛІМПІЙЦЫ Ў БЕЛАРУСІ,

ці Маленне беларускаму слову

Пераможцаў 13-й алімпіяды па беларускай мове, якая штогод праходзіць у Польшчы, у чарговы раз прыняў Белдзяржуніверсітэт. Арганізатарамі паездкі выступілі кафедра беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта, Пасольства Беларусі ў Польшчы і Таварыства дружбы «Беларусь — Польшча». Гэтай падзеі міністэрствы адукацыі абедзвюх краін надаюць вялікае значэнне як значнаму фактару ў развіцці кантактаў і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі.

Ініцыятарамі правядзення падобнай алімпіяды з'яўляюцца прафесары Варшаўскага ўніверсітэта Алесь Баршчэўскі і Браніслаў Хмялінскі.

Прафесар Баршчэўскі (які, дарэчы, і ўзначальвае аргкамітэт алімпіяды) у сувязі з хваробай у гэты раз не змог суправаджаць пераможцаў:

— Перад ад'ездам у Беларусь я размаўляў з прафесарам пра алімпіяду, — расказвае яго калега Мікола Хаўстовіч. — Ён цешыцца, што ёсць магчымасць сабрацца ў зале вучонай рады БДУ, што ўзнагароджванне праходзіць у краіне, дзяржаўная мова якой — беларуская.

У зале вучонай рады алімпійцаў павітаў рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў. Прыйшлі павіншаваць пераможцаў і прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Таварыства дружбы «Беларусь — Польшча», Саюза пісьменнікаў Беларусі, часопісаў «Народная асвета», «Нёман» і інш.

— Я так рады, што і за межамі Беларусі жывуць людзі, якія вывучаюць маю любімую беларускую мову, — сказаў рэдактар дзіцячага беларускамоўнага часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі і падарыў «беларускім палякам» Васілінку, якую ім даверыў сам Вася Вясёлкін.

Для гасцей-пераможцаў падрыхтавалі пазнавальную культурную праграму. Дзеці і іх настаўнікі пазнаёміліся з горадам, атрымалі майстар-клас на філалагічным факультэце БДУ (пасля аглядной экскурсіі па музею беларускай народнай культуры на філфаку пераможцы алімпіяды зацікавіліся, дзе можна набыць Біблію на беларускай мове), наведалі Нацыянальную бібліятэку, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, дзе паглядзелі спектакль «Маці». А самым запамінальным і насычаным стаў падарунак рэктара БДУ — наведванне музея старажытных рамёстваў у Дудутках.

Акрамя гэтага, польскія школьнікі пазнаёміліся з беларускімі лаўрэатамі алімпіяды па беларускай мове.

— Каб абараняць інтарэсы краіны на міжнародным узроўні, трэба ведаць не толькі мову і літаратуру, але і гісторыю сваёй краіны, — стала разважае двухразовы лаўрэат алімпіяды па беларускай мове, студэнтка 1-га курса факультэта міжнародных адносінаў БДУ Ганна Радзько. — Алімпіяда, я пераканалася, садзейнічае гэтаму.

Да ўдзелу ў алімпіядзе польскіх вучняў заахвочваюць з першых класаў.

На Беласточчыне знаходзяцца два ліцэі з беларускай мовай навучання: адзін — у Бельску-Падляскім, другі — у Гайнаўцы. 28 пераможцаў алімпіяды, вучняў гэтых ліцэяў, атрымалі магчымасць наведаць Беларусь. Адметна, што ў гэтых польскіх навучальных установах надаецца ўвага не толькі беларускай мове і літаратуры, але звычаям і традыцыям беларускага народа, праводзяцца выязныя семінары ў нашу краіну, дзе вучні пад кіраўніцтвам настаўнікаў збіраюць фальклор.

Настаўніца ж беларускай мовы Яўгенія Таранта рыхтуе да алімпіяды не толькі чужых дзяцей, але і сваіх. Яе дачка зараз з'яўляецца студэнткай Варшаўскага ўніверсітэта, дзе вывучае беларускую мову. А сын Рыгор у гэтым годзе заняў 1-е месца ў алімпіядзе і прыехаў разам з маці ў Мінск.

Адрыян Федарук у Мінску ўжо другі раз. Толькі ў мінулым годзе ён прыязджаў сюды ў якасці фіналіста, зараз жа ён — уладальнік дыплома другой ступені.

— Я з маленства быў звязаны з беларускай мовай. Усё лета праводзіў у бабулі ў вёсцы. Бабуля размаўляла на дыялекце, набліжаным да беларускай мовы. Ды і дома бацькі гавораць «па-свойму».

— Адрыян, а як ты рыхтаваўся да алімпіяды?

— На ўроках закладваўся толькі фундамент. Бо трох гадзін на тыдзень беларускай мовы і літаратуры недастаткова, каб паказаць выдатныя веды на цэнтральнай алімпіядзе. Усё астатняе залежала толькі ад мяне, ад самастойнай працы. Раз на тыдзень наведваў факультатыўныя заняткі. Менавіта там настаўніца рыхтавала нас да вуснага паведамлення.

— А хто з беларускіх пісьменнікаў табе падабаецца?

— Максім Багдановіч, Уладзімір Караткевіч, Максім Танк. На алімпіядзе ж я выцягнуў білет, звязаны з творчасцю Васіля Быкава. Абрадаваўся. Я ж вучыўся ў гуманітарным класе, люблю гісторыю, асабліва цікавіць перыяд Другой сусветнай вайны. А асноўная тэматыка твораў Быкава менавіта ваенная.

Перамога на алімпіядзе адкрыла Адрыяну дзверы ў Варшаўскі ўніверсітэт, у які ён марыў паступіць.

— Але самае галоўнае тое, што я, рыхтуючыся да алімпіяды, стаў багатым чалавекам. У Польшчы ўсе кантактуюць ці па-польску, ці на дыялекце, але, калі будзе такая магчымасць, я з задавальненнем буду размаўляць па-беларуску.

Паводле слоў Адрыяна, беларуская мова стала, як і польская, яго роднай мовай. Паездка ж у Беларусь дала шанц пазнаёміцца з удзельнікамі алімпіяды, даведацца, як яны рыхтаваліся, абмяняцца тэлефоннымі нумарамі.

Янка Брыль сцвярджаў, што, чытаючы кнігу, ён не б'е бібікі, а працуе. Калі з ім не пагаджаліся, гаварыў: «Ну тады лічыце, што я малюся. Малюся слову». Маленне слову польскіх школьнікаў дало ім узнагароду. Гэта і перамога, і паступленне ва ўніверсітэты (пераможцы алімпіяды будуць мець ільготы пры паступленні ва ўніверсітэты як Польшчы, так і Беларусі), і падарожжа ў Мінск, і памятныя падарункі ад розных устаноў краіны-суседкі, і новыя сябры...

Надзея ДРЫЛА.
Фота аўтара.

Уладзімір ЛІПСКІ: *«Васілінка паедзе ў Польшчу разам з дыпламантамі».*

«МІНСК-АРЭНА» ЧАКАЕ СТУДЭНЦКІ ДЭСАНТ

20 студэнцкіх атрадаў сфарміравана сёлета ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Усяго падчас летняга працоўнага семестра будуць працаваць сёлета больш як 1 тысяча чалавек.

У пералік будаўнічых аб'ектаў, дзе чакаюць студэнтаў БДУ, увайшлі кінатэатр «Беларусь», спартыўна-культурны комплекс «Мінск-арэна», гаражны комплекс па вуліцы М. Багдановіча ў сталіцы. Акрамя таго, юнакі і дзяўчаты будуць займацца добраўпарадкаваннем і падрыхтоўкай да новага навучальнага года васьмі студэнцкіх інтэрнатаў БДУ, працаваць выхавальнікамі ў спартыўна-аздараўленчым комплексе «Брыганціна» ў Радашковічах і ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Зорка» ў Лагойскім раёне, займацца ўкладкай тратуарнай плітак на вуліцах сталіцы, дапамагаць ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, арганізоўваць культурна-асветніцкія мерапрыемствы ў дзіцячых садках, працаваць у РУП «Шчомысліца» і г. д.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дэбют

БЕЛАРУСЫ ЗГУЛЯЮЦЬ НА ЧЭМПІЯНАЦЕ СВЕТУ ПА ФУТБОЛУ

Не здзіўляйцеся. Размова не аб падначаленых Юрыя Пунтуса, а аб футбольнай камандзе «Art Stars», якая возьме ўдзел у першым у гісторыі чэмпіянаце свету сярод зборных, скамплектаваных з прадстаўнікоў шоў-бізнэсу, эстрады і спорту. Беларусы згуляюць у групе «D» разам з камандамі Аргенціны, Японіі і Камеруна, за апошнюю, дарэчы, выступае спявак П'ер Нарцыс, выпускнік расійскай «Фабрыкі зорак».

Турнір адбудзецца з 24 чэрвеня па 4 ліпеня ў Сочы з мэтай падтрымкі гэтага расійскага горада, што прэтэндуе стаць сталіцай зімовай Алімпіяды-2014, а таксама ў рамках дабрачыннай акцыі «Пад сцягам дабра» (сродкі будуць накіраваны на лячэнне дзяцей Краснадарскага краю). Паралельна з футбольнымі матчамі пройдуць 10 гала-канцэртаў па паўтары гадзіны кожны. Беларусы выступяць на цырымоніі адкрыцця (свой нумар падрыхтавалі Вячаслаў Харанека і Альберт Скараход) і ў асобны ад гульняў дзень разам з артыстамі расійскай каманды «Старко».

Чэмпіянат свету планавалі правесці яшчэ ў 2000 годзе ў Маскве, але па розных прычынах не атрымалася яго арганізаваць. Заявы на ўдзел у першынстве-2007 даслалі звыш 35 краін, але адабралі толькі 16. Як сярод іх апынулася беларуская? Адбор вёўся, улічваючы заслугі каманд.

— Некаторыя зборныя існуюць не так даўно, — тлумачыць капітан «Art Stars» Альберт Скараход, — ці не праводзяць рэгулярных трэніровак, а нашай камандзе ўжо 13 гадоў, яна зарэкамендавала сябе: за час свайго існавання мы правялі звыш 40 матчаў, сярод іх сустрэчы з расійскай камандай «Старко», прычым шэсць гадоў таму мы ўступілі ёй у Мінску (2:3), але ў 2003-м у Маскве ўзялі рэванш з такім жа лікам.

Паводле меркавання капітана, на чэмпіянат паехалі не ўсе вартыя гэтага каманды, асабліва з прадстаўнікоў былога СССР, таму Альберт Скараход плануе заручыцца падтрымкай прадстаўнікоў федэрацыі футбола і спонсараў і правесці ў Беларусі Кубак СНД, а потым можна замахнуцца і на турнір больш высокага ўзроўню.

— У нашу каманду могуць уваходзіць усе жадаючыя. Галоўнае — жаданне гуляць у футбол і, каб была дысцыпліна, — кажа трэнер «Art Stars» і сталічнага клуба МТЗ-РІПО Анатоль Алейнікаў.

Паводле рэгламенту чэмпіянату ў камандзе могуць быць вядомыя артысты (у «Art Stars» гэта — Анатоль Длускі, Дзмітрый Смольскі і г. д.), адзін вядомы спартсмен (Вячаслаў Харанека), два ветэраны футбола (галкіпер Юрый Кусенка і абаронца Анатоль Алейнікаў).

— На жаль, склад нашай каманды ў Сочы не змогуць узмацніць удзельнікі гурта «Новы Іерусалім», бо яны зараз знаходзяцца на гастролях у ЗША, а спявак Андрэй Хлястоў зламаў нагу, — паведамляе выканаўца, паўабаронца Сяргей Мінскі.

Якія задачы ставіць перад сабой каманда? Майстар спорту міжнароднага класа па гіравому спорту Вячаслаў Харанека на гэта пытанне адказвае так: «Які б ні быў футбол — аматарскі ці прафесійны — мы прадстаўляем сваю краіну. Нам выдалі два камплекты формы, разам з намі будуць сцяг і гімн Беларусі, таму мы адчуваем адказнасць і гатовыя выкласціся па максімуму, каб потым нам не было соромна і крыўдна».

Цікава, што ў якасці талісмана беларусы возьмуць у Сочы... вожыка, бо лічаць, што ён асацыюецца з іх стылем гульні. Паглядзім, ці прынясе ён удачу на першым чэмпіянаце свету па футболу.

Ірына ПРЫМАК.

Акцыі

16 КМ У ДЗЕНЬ — У ІМЯ ЧЫСТАЙ ВАДЫ

На тэрыторыі нашай краіны з 22 па 26 чэрвеня адбудзецца міжнародны прабег «Блакітная планета», мэтай якой — павышэнне разумення праблем забруджання воднага асяроддзя.

Як паведамілі рэдакцыі ў Дзяржаўнай установе «Цэнтркурорт», фонд «Блакітная планета» ўжо прафінансаваў больш як 29 праектаў у 10 краінах свету, якія закранаюць праблему забеспячэння пітной вадой 200 мільёнаў чалавек.

Сёння многія народы сутыкнуліся з праблемай надзвычайнай патрэбы ў чыстай пітной вадзе для падтрымання жыцця, паляпшэння здароўя і ўвогуле захавання свету. Доступ да чыстай пітной вады стане першым крокам у вырашэнні многіх праблем сусветнай супольнасці, з якімі яна сутыкаецца паўсядзённа.

Сёлета Фонд Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па міжнароднаму супрацоўніцтву зацвердзіў праект «Прабег «Блакітная планета». Менавіта пад эгідай ААН ДУ «Цэнтркурорт» ажыццяўляе арганізацыю гэтага экалагічнага прабегу. Сёлетні прабег «Блакітная планета» мае даўжыню 24 320 кіламетраў і пралягае па 41-й паўночнай паралелі праз 16 краін 4 кантынентаў на працягу 95 дзён. Пачаўся прабег у Нью-Йорку 1 чэрвеня. У мерапрыемстве ўдзельнічаюць 20 спартсменаў ЗША, Мексікі, Расіі, Англіі, Японіі, Кітая, Бразіліі, Аргенціны, Балівіі, Перу, Венесуэлы, Аўстрыі, Новай Зеландыі, Гвінеі, ПАР, Марока, Кеніі, Эфіопіі, Ізраіля і Канады, якія бягуць без перапынку 24 гадзіны ў суткі па чарзе. Маршрут прабегу пралягае па тэрыторыях ЗША, Ірландыі, Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі, Нідэрландаў, Германіі, Аўстрыі, Чэхіі, Польшчы, Беларусі, Расіі, Манголіі, Кітая, Японіі і Канады. Кожны бягун павінен прабегчы па 16 кіламетраў кожны дзень. Эстафета будзе перадавацца ў 1500 пунктах перадачы. У Лондане перадача адбудзецца на Трафальгарскай плошчы, у Парыжы — ля Трыумфальнай аркі.

У Мінску перадача эстафеты запланавана на праспекце Пераможцаў у раёне Палаца спорту 24 чэрвеня ў 15.00. Прабег завершыцца ў Нью-Йорку 4 верасня.

На думку арганізатараў прабегу, гэтае мерапрыемства павінна актывізаваць сусветную свядомасць і павялічыць фінансаванне фонду за кошт прыцягнення грашовых сродкаў для праектаў, якія звязаны з праблемамі чыстай пітной вады на ўсёй тэрыторыі планеты.

Сяргей КУРКАЧ.

ПЕРАМОЖЦЫ АЛІМПА НАРАДЖАЮЦЦА НА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ СПАРТАКІЯДЗЕ

Спартыўныя школы ўсё больш папулярныя сярод моладзі

Паўстагоддзя таму будучыя спартыўныя чэмпіёны басаногай дваровай камандай ганялі мяч усюды, дзе можна было знайсці хоць крыху месца для любімых заняткаў. Пераможцаў будучых Алімпіяд трэнеры адбіралі на самаробных гульнявых пляцоўках, дзе дзятва збіралася кожны дзень, з пачатку раставання першага снегу і ажно да ліставападаўскіх маразоў. Потым спартыўныя кіраўнікі зразумелі, што выхоўваць сусветнавядомых рэкардсменаў лепш у спецыяльна створаных месцах, і так у краіне пачало з'яўляцца ўсё больш ДзЮСШаў, школ алімпійскага рэзерву і іншых цэнтраў падрыхтоўкі юных зорак вялікага спорту. Лозунг «Спорт у масы» стаў сапраўдным арыенцірам на многія гады наперад. Менавіта дзякуючы яму мільёны пасляваенных школьнікаў выраслі здаровымі людзьмі, змаглі нарадзіць і паставіць на ногі дужае пакаленне сваіх дзяцей. Сучасныя адносіны да спорту засталіся такімі ж. Краіна, якая хоча мець надзейную будучыню, павінна з дзяцінства развіваць любоў да спорту. Ужо некалькі гадоў выпускнікі беларускіх школ з усё большым задавальненнем здаюць экзамены па фізічнай культуры, акрамя таго, пачала праводзіцца алімпіяда па фізічнай культуры. А восенню пройдзе ўжо рэспубліканская прадметная алімпіяда па гэтай школьнай дысцыпліне.

У нашай краіне працягваецца традыцыя разнастайных спартакіяд, спаборніцтваў, спартыўных гульняў. Святы фізічнай культуры заўсёды прыцягваюць цікавасць дзяцей і дарослых. Так склалася, што самай аўтарытэтнай спартыўнай падзеяй у свеце масавага дзіцячага спорту сёлета стала Рэспубліканская комплексная спартакіяда школьнікаў па 23 відах, якая прайшла з 11 па 21 чэрвеня ў трох абласных цэнтрах — Віцебску, Брэсце, Магілёве, а таксама ў Оршы і Полацку. З савецкіх часоў правядзення такіх спартыўных святаў спартакіяды дазваляюць узняць асабісты узровень, напрыклад, юнак можа выканаць праграму майстра спорту ці кандыдата ў майстры. Самых таленавітых ўдзельнікаў абавязкова заўважаюць спецыялісты, якія шукаюць новых, перспектыўных зорак-прафесіяналаў.

У спартакіядзе бралі удзел каманды са сталіцы і з кожнай вобласці. Акрабатыка, баскетбол, грэка-рымская барацьба, вольная барацьба, бокс, веласпорт, мастацкая гімнастыка, веславанне на байдарках і каноэ, тэніс, цяжкая атлетыка, гандбол. На спаборніцтвы прыяджала больш за 3000 дзяцей з усёй Беларусі, толькі з Мінскай вобласці ў спартакіядзе ўзялі удзел 435 удзельнікаў.

Юнацкія спартыўныя школы, як і гадоў трыццаць таму, могуць зараз дазволіць сабе адбіраць да ўдзелу ў аўтарытэтных спаборніцтвах толькі лепшых, і падрыхтаваць іх належным чынам. Але памятаюць яшчэ дырэктары беларускіх школ час, калі нават не было чым заплаціць за абагрэў вады ў басейне — у некаторых школах займаліся толькі па суботах і нядзелях, і тое калі дазваляў стан цеплатрас. Зараз сітуацыя нармалізавалася. Актыўны лад жыцця сучаснага школьніка спалучаецца з карысным баўленнем часу. Пасля школы моладзь наведвае трэніровачныя залы, а які, дарэчы, можна знайсці лепшы занятак пасля ўрокаў?

На Міншчыне працуюць 59 дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ. За мінулы год трэнеры цэнтральнага рэгіёна падрыхтавалі 13 майстроў спорту міжнароднага класа і 121 майстра спорту нашай краіны. Ужо зараз на ўдзел у Пекінскай алімпіядзе прэтэндуюць 43 спартсмены з вобласці. Між тым, цікавасць да спорту праяўляюць не толькі тыя, хто вырашыў звязаць сваё жыццё з дасягненнямі ў галіне вялікага спорту. Амаль па ўсёй Беларусі ў спартыўныя школы маладыя людзі запісваюцца з самага ранняга ўзросту ў масавым парадку. Канешне, з-за

Спаборніцтва па валейболу ў Віцебску.
Фота БЕЛТА.

напружанай дэмаграфічнай сітуацыі скарачаецца колькасць школьнікаў агульнаадукацыйных школ, і, адпаведна, наведвальнікаў вучэбна-спартыўных устаноў. Але з кожным сезонам усё больш юнакоў і дзяўчат выбіраюць спорт і фізічную культуру асноўным сваім заняткам у вольны час. Так, калі шэсць гадоў таму працэнт прыцягнення новых аматараў спорту з ліку школьнікаў цэнтральнай вобласці да пастаянных заняткаў спортам складаў 8,9 працэнта, то ўжо летась колькасць наведвальнікаў спартыўных школ узрасла да 14,1 працэнта.

— У нашай школе ўстойлівая пераемнасць пакаленняў. Да нас прыязджаюць працаваць былыя выхаванцы ўстановы, — адзначае дырэктар Слуцкай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву Аляксандр Панцялееў. — Памятаю час, калі ў год прыходзілі да нас займацца каля 600 дзяцей. Зараз спартыўную падрыхтоўку стабільна атрымліваюць у нас больш за 750 школьнікаў. Пры тым, што ў горадзе ёсць яшчэ шмат іншых цэнтраў, заняткі ў якіх дазваляюць дзіцяці з карысцю праводзіць свой вольны час. Дзякуючы таму, што два гады таму ў горадзе праводзіліся свята рэспубліканскіх «Дажынак», школа змагла істотна паправіць сваю базу. Адрамантавалі гульнявую залу, паставілі новыя вокны і дзверы, у басейне з'явіліся вітражы і новы дах.

Самае галоўнае, што захавалі вучэбна-спартыўныя ўстановы, — гэта бясплатныя заняткі. Наведваючы спартыўную школу, дзіця набывае бясцэнны скарб — яно замацоўвае здароўе на ўсе жыццё. І за тое, што немагчыма атрымаць ні за якія фінансавыя сродкі, бацькам не трэба траціць грошы. Каб пакрываць выдаткі на адукацыю дзяцей, ДзЮСШы самастойна шукаюць крыніцы, іншымі словамі — прадаюць свае паслугі ўсім аматарам здаровага ладу жыцця. За 2006 год спартыўныя школы цэнтральнага рэгіёна зарабілі 405 мільёнаў рублёў за кошт продажу абанементаў у басейн, паслуг саўны, трэнажорных залаў, арэнды памяшканняў для гульні ў футбол, спартыўных танцаў, заняткаў у спартыўных секцыях для дарослых.

ДзЮСШам быць, і ў гэтым сумненняў няма. Канешне, у іх дзейнасці не абыходзіцца і без праблем, якія актуальныя для ўсіх навучальна-спартыўных устаноў Беларусі. Трэнеры жадалі б атрымліваць большую заработную плату, многія спецыялісты з ліку маладых кадраў маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Часам у школах адсутнічае і ўласная матэрыяльна-тэхнічная база. Аднак з цягам часу ўсё вырашыцца. Галоўнае, што школы не страцілі свайго патэнцыялу, і таму ім застаўся толькі адзін шлях — развіццё.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Муз-news

ЗАЯЎКА НА БЯСКОНЦАСЦЬ

Колішняя выпускніца ансамбля «Верасяты», спявачка Улада прадставіла свой новы кліп «Infinite», дзе, акрамя самой артысткі, зняўся расійскі акцёр тэатра «Ленком» Дзмітрый Мар'янаў, вядомы гледачам па рабоце ў фільмах «Дарагая Алена Сяргееўна», «Дасье дэтэктыва Дуброўскага», «Прэзідэнт і яго ўнучка» і г. д.

У перакладзе з французскай мовы «infinite» азначае «бясконцасць». А пра што яшчэ можна спяваць бясконца, як не пра каханне! Паводле сюжэтнай лініі, у кожнага чалавека ёсць свой востраў, дзе месца хапае толькі на аднаго. Рэжысёр кліпа, Вячаслаў Слюсар, пасяліў на розныя астравы мужчыну і жанчыну, але даў ім магчымасць сустрэцца і, быць можа, змяніць звыклы парадак рэчаў...

Дарэчы, гэты ролік у спявачкі — пяты па ліку, і, паводле сцвярджэння самой Улады і яе прадзюсара Сяргея Ждановіча, самы лепшы. Дзяўчына засталася цалкам задаволеная вынікамі работы, нягледзячы на тое, што давялося здымацца ў адкрытых сукенках у халоднай студыі, пры гэтым артыстку палівалі вадой і абдзімалі павеятрам, ствараючы ілюзію спякотнага востраva.

АЛЕНА ГРЫШАНАВА: «LOVE STORY» З ПРАЦЯГАМ

Завяршылася першая частка вялікага гастрольнага туру Алены Грышанавай па Беларусі. Разам з шоў-балетам «EllitBitt» спявачка правезла новую сольную праграму «Яго Вялікасці Каханню...» па Гродзенскай вобласці. Як сцвярджае калектыў артысткі, выступленні паўсюдна праходзілі «на ўра».

«Мы не падзяляем публіку на сталічную і рэгіянальную, таму імкнуліся ва ўсіх гарадах паказаць якаснае шоў з прыгожымі дэкарацыямі, прафесійным святлом і гукам. Дзеля гэтага з калектывам ездзілі яшчэ некалькі машын з апаратурай», — расказала дырэктар спявачкі і рэжысёр праграмы Анжэліна Мікульская.

Удзячная публіка ў адказ не проста дарыла кветкі і апладысменты артыстам, але старалася зрабіць ім што-небудзь прыемнае. Скажам, у Карэлічах гаспадары кафэ «Love Story» наладзілі для ўсяго калектыву вечар адпачынку — з прыемнай музыкай, душэўнымі размовамі і ўсякімі ласункамі. А ў далейшую дарогу падарылі спявачцы вялікі кошык яблыкаў — «падвітамінілца».

ДЗМІТРЫЙ КАЛДУН: ПЛЮС КВАТЭРА, МІНУС ПРАДЗЮСАР

Беларускага пераможцу «Фабрыкі зорак», нарэшце, аддалі ў надзейныя рукі. Ціха, без скандалаў артыст развітаўся з прадзюсарам Віктарам Дробышам, удзел якога ў лёсе спевака скончыўся на размахванні беларускім сцягам падчас «Еўрабачання-2007».

Зараз у Калдуна новы прадзюсар, прызначаны Першым каналам — Аляксандр Лунёў, вядомы па супрацоўніцтву з Дзімам Біланам (у прыватнасці, менавіта ён напісаў музыку да песні «Never Let You Go»). Да канца года Лунёў усё ж збіраецца зрабіць першаму свайму падапечнаму альбом, дзеля чаго запісана некалькі новых песень.

Нагадаем, пасля ўдалага выступлення на «Еўрабачанні-2007», дзе ён заняў 6-е месца, Дзмітрый Калдун стаў стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, атрымаўшы прэмію ў памеры 15 тысяч долараў і льготны крэдыт на будаўніцтва 3-пакаёвай кватэры ў Мінску. Будучае жыллё спявак выбраў у мікрараёне Кунцаўшчына, каб не з'язджаць далёка ад сяброў і родных. Але пакуль кватэра будуецца, Калдун знаходзіцца ў Маскве, дзе напружана працуе. Нават свой 22-і дзень нараджэння Дзіма сустрэў у расійскай сталіцы, на вечарынцы ў адным з клубаў. Прыхільніцы падарылі артысту кававarку, мноства кветак і... гітару з цукерак. А старэйшы брат Георгій, хоць і прыехаў у Маскву павіншаваць, свой падарунак збіраецца ўручыць Дзіму пазней — калі той зноў зазірне на радзіму. Восенню гэта давядзецца зрабіць у любым выпадку — і каб новую кватэру абжыць, і каб апошнюю сесію (Дзіма заканчвае хімфак БДУ) здаць.

ІРЫНА ІТЭРА: АБ ЧЫМ МАРЫЦЬ ЖАНЧЫНА

Абкатаўшы дэбютную песню «Усё прайшло», новая на беларускай сцэне спявачка (а разам з тым, па чутках, яшчэ і паспяховая бізнэс-лэдзі) Ірына Ітэра штурмуе радыёстанцыі з наступнай, абсалютна летняй кампазіцыяй «Мара».

Як мяркуе аўтар песні Уладзімір Хадасевіч, гэта своеасаблівая музычная «бандзіяна» — як галівудскі фільм аб прыгожым жыцці, у якім мільгаюць модныя назвы, імёны, маркі аўто і курорты. «Самае забаўнае, што песня была запісаная зімой, калі на вуліцы стаяў сабачы холад, — прыгадвае Хадасевіч. — Проста прыйшоў дадому, сеў за піяніна, і адразу нарадзіліся патрэбныя вобразы. Напэўна, сапраўды ў тую завіруху мне вельмі хацелася лета».

Сама ж спявачка адзначае, што самым складаным было «пранікнуцца» гламурным тэкстам знутры, каб і перадаць патрэбную атмасферу, і пры гэтым захаваць дастаткова самаіроніі.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Па-за школай

Заняткамі па інтарэсах ахоплены кожны трэці школьнік

На сёння ў нацыянальнай сістэме адукацыі дзейнічае каля 350 устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, якія ахопліваюць 378 тысяч чалавек. На іх базе пастаянна працуюць 29 245 гурткоў і іншых аб'яднанняў па інтарэсах.

Нягледзячы на агульнае скарачэнне колькасці беларускіх школьнікаў, звязанае з дэмаграфічнай сітуацыяй, за апошнія пяць гадоў колькасць дзятвы, ахопленай сістэмай пазашкольнага выхавання, павялічылася на 31 тысячу чалавек. Самыя высокія паказчыкі занятасці дзяцей у гуртках назіраюцца ў Мінску і Магілёўскай вобласці (адпаведна 47,5 і 45,4 працэнта), а найменшыя — у Брэсцкай і Гомельскай абласцях (24,8 і 26,2 працэнта). Пры гэтым у Столінскім раёне занятасць дзяцей складае толькі 9,3 працэнта, у Пінску — 12,1, а ў Лунінецкім раёне — 13,3 працэнта.

У агульнай структуры гурткоў сёння пераважаюць гурткі мастацкай творчасці, але гэта структура адлюстроўвае не рэальныя патрэбы дзяцей, а, хутчэй, магчымасці ўстаноў пазашкольнага выхавання. Гурткі тэхнічнай творчасці, судна-і авіямадэлізму, эколага-біялагічныя і турысцка-краязнаўчыя сёння не могуць пры няць усіх жадаючых. Чаго хаваць, менавіта тэхнічная творчасць патрабуе асабліvых матэрыяльных затрат, тым не менш за апошні час колькасць гурткоў тэхнічнай творчасці павялічылася на 15 працэнтаў. Акрамя Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці навучэнцаў у Беларусі існуюць яшчэ 30 цэнтраў, якія развіваюць гэты накірунак, і прыкладна ў палове са 177 шматпрофільных устаноў таксама ёсць адпаведныя гурткі.

Дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, сёння ў Беларусі налічваецца 39 тысяч. Прыкладна 40 працэнтаў з іх займаюцца ў рознага роду гуртках. У пазашкольных установах пакуль што слаба арганізаваная работа псіхолага-педагагічнай службы.

Увогуле, камплектаванне кадрамі застаецца ключавой праблемай развіцця сістэмы пазашкольнага выхавання і навучання. Толькі за апошнія чатыры гады ў сістэме былі створаны больш за тысячу новых працоўных месцаў для педагагічных работнікаў. Тая акалічнасць, што многія кіраўнікі гурткоў не маюць педагагічнай адукацыі, ні для кога не з'яўляецца сакрэтам. Тлумачэнне гэтаму простае — у педагагічную сферу прыходзяць спецыялісты з іншых сфер нашага жыцця. З дзецьмі працуюць вельмі апантаныя і ўлюбёныя ў сваю працу людзі. Прычым працуюць літаральна за «капейкі» — заработная плата работнікаў сістэмы пазашкольнага выхавання і навучання застаецца адной з самых нізкіх у нацыянальнай сістэме адукацыі. Мэтанакіравана педагогаў для сістэмы пазашкольнага выхавання рыхтуюць у краіне лічаныя навучальныя ўстановы. Ніхто і не спрабаваў сфарміраваць сацыяльны заказ на іх падрыхтоўку.

Асобна стаіць праблема матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў пазашкольнага выхавання і навучання. Знос большасці яе будынкаў складае 70—80 працэнтаў, многія пазашкольныя ўстановы размяшчаюцца ў непрыстасаваных будынках. За апошнія 10 гадоў (акрамя Палаца моладзі і школьнікаў у Заводскім раёне сталіцы) у Беларусі не было пабудавана ніводнага новага будынка. А будынак, у якім размяшчаецца Гомельскі дзяржаўны абласны цэнтр тэхнічнай творчасці навучэнцаў, быў пабудаваны яшчэ ў 1906 годзе і на сёння яму патрабуецца капітальны рамонт.

З верасня мінулага года на сайце Міністэрства адукацыі (www.minedu.unibel.by) у раздзеле «Узроўні навучання» быў адкрыты новы падраздзел «Пазашкольнае выхаванне і навучанне». Любы карыстальнік, які мае выхад у Інтэрнэт, можа знайсці там адрасы і тэлефоны ўсіх пазашкольных устаноў краіны, атрымаць інфармацыю аб іх дзейнасці з іх уласных сайтаў, даведацца аб фестывалях і конкурсах, якія праводзяцца на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях.

Плануецца, што з цягам часу на сайце з'явіцца спецыяльны форум для бацькоў, дзе будуць ладзіцца Інтэрнэт-канферэнцыі з дырэктарамі пазашкольных устаноў, псіхолагамі і педагогамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«МАКАДЗЕ»* НАД РЭСПУБЛІКАЙ

Рэчаіснасць канстатуе сумны факт: на сёння маштабы і тэндэнцыі незаконнага вырабу, попыту і абароту наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў на тэрыторыі Беларусі ўяўляюць сабой сур'ёзную пагрозу для здароўя і дабрабыту нашых грамадзян.

У наркабізнэс злачынцаў прыцягвае высокая прыбытковасць гандлю наркотыкамі. У залежнасці ад ступені аддаленасці месца спажывання «зелля» ад месца яго вырабу або паходжання цана можа павялічвацца ў 15 разоў. Напрыклад, у Нідэрландах цана 1 грама амфетаміну складае 2 долары ЗША, а ў нас «цэннік» падымаецца да 30.

Паводле аператыўных звестак, цяпер на наркарынку Беларусі сфарміраваліся наступныя рознічныя цэны ў амерыканскай валюце за 1 грам асноўных відаў наркотыкаў: гашыш — 12—20, гераін — 35—40, экстазі — 50—60, какаін — 100—120 і метадон — 120—150.

Імкненне любой цаной здабыць неабходныя грошы для набыцця «дозы» падштурхоўвае наркамана на злачынства. Каля 40 працэнтаў ад агульнай колькасці прыцягненых да адказнасці за ўчыненне дзеянняў па лініі незаконнага абароту наркотыкаў — гэта раней судзімыя за аналагічныя правапарушэнні. Толькі летась праваахоўнымі органамі рэспублікі выяўлена каля 5000 злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў, канфіскавана 16 кілаграмаў гатовых формаў наркотыкаў, каля 10 — псіхатропных рэчываў, 720 — макавай саломкі і марыхуаны. Усяго за апошняе дзесяцігоддзе да крымінальнай адказнасці за ўчыненне нарказлачынстваў прыцягнута больш як 25 тысяч чалавек.

Асноўная маса наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў паступае ў Беларусь па так званаму паўночнаму маршруту: з краін Цэнтральнай Азіі праз Расію і транзітам праз тэрыторыю рэспублікі ў Літву і далей на Захад правозяцца гераін, метадон, трыметылфентаніл, рагіпнол. Макавую саломку і опій завозяць з Украіны. З Еўропы незаконна перамяшчаюць МДМА (экстазі), амфетамін, марыхуану, гашыш і какаін.

Летась сумесна з кампетэнтнымі органамі Расійскай Федэрацыі, Кыргызскай Рэспублікі, Літвы, Польшчы і Германіі беларускія змагары з наркотыкамі ўзялі ў распрацоўку арганізаваную злачынную групу, якая займалася распаўсюджваннем наркотыкаў. Вынікам цеснага ўзаемадзеяння стала затрымманне ў канцы верасня на пагранпераходзе «Autobahn» у нямецкім горадзе Гёрніц грамадзяніна ФРГ. Пры аглядзе яго аўтамабіля быў выяўлены пакет з 400 грамамі гераіну, які «накіроўваўся» транзітам праз Беларусь у Германію.

У лютым 2007 года на тэрыторыі Германіі супрацоўнікі паліцыі г. Нойс затрымалі грамадзяніна ФРГ, у аўтамашыне якога знойдзена каля 3 кілаграмаў метамфетаміну, прызначанага для пастаўкі ў Беларусь.

Разам з тым злачынцы ўсё часцей адмаўляюцца ад паставак гатовых формаў наркотыкаў у Беларусь. Назіраецца тэндэнцыя да ўвозу пракурсораў і далейшага вырабу з іх наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Паводле звестак Дзяржаўнага мытнага камітэта, у 2006 годзе мытнымі органамі ва ўзаемадзеянні з Дзяржаўным камітэтам пагранвойскаў спынена 45 фактаў кантрабанды і незаконнага абароту наркатычных сродкаў. Пагранічнікамі затрымана 20 кілаграмаў наркотыкаў, 2 — псіхатропных рэчываў і 76 — пракурсораў. Актыўная работа вялася і ўнутры краіны. Напрыклад, летась супрацоўнікамі ўпраўлення па наркакантролю і процідзеянню гандлю людзьмі МУС Беларусі сумесна з Федэральнай службай па кантролю за наркотыкамі Расіі, спецслужбамі Польшчы, Літвы, Германіі і Галандыі падчас правядзення кантралюемых паставак канфіскавана 800 літраў пракурсору БМК (бензол-метыл-кітон), дастатковага для вырабу каля 600 кілаграмаў сінтэтычных наркотыкаў. Выходзячы з гэтага, прагназуецца ўсплёск з'яўлення падпольных лабараторый па вытворчасці сінтэтычных наркотыкаў на тэрыторыі рэспублікі. Паводле прыкладных разлікаў, пры затраце 1000 еўра на забеспячэнне дзейнасці лабараторыі па выхаду прадукцыі даход складзе не менш як 80 000. За апошнія два гады ліквідавана ўжо 8 падобных падпольных вытворчасцяў.

Цяпер наркотыкі расліннага паходжання паступова выцясняюцца сінтэтычнымі. Напрыклад, працягвае пашырацца геаграфія распаўсюджання новага сінтэтычнага наркотыку трыметылфентанілу («белага кітайца»), які па ўздзеянню ў шмат разоў перавышае гераін. Адзін грам гэтага наркотыку ў чыстым выглядзе можна раздзяліць на 500 разавых доз. Такое моцнае ўздзеянне прэпарату прыводзіць да частых смярцей ад перадазіроўкі ў асяроддзі наркаманаў, што яго ўжываюць.

Даведка. Пад наглядам наркалагічнай службы Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь на 1 студзеня 2007 года знаходзілася каля 14 тысяч наркаманаў і таксікаманаў (трэцяя частка з іх — ва ўзросце ад 21 да 25 гадоў). Летась ад перадазіроўкі наркотыкаў загінула больш як 100 чалавек. Пры гэтым ніхто не мае дакладных звестак аб смяротнасці насельніцтва ад хвароб, якія спадарожнічаюць ужыванню наркотыкаў (хваробы печані, сардэчная і ныркавая недастатковасць, лёгачная паталогія і г. д.), што з'яўляюцца асноўнымі прычынамі лятальнага зыходу сярод спажыўцоў наркотыкаў. 65 працэнтаў з аналь 8 тысяч ВІЧ-інфіцыраваных і хворых на СНІД заразіліся, уводзячы наркатычныя сродкі шляхам ін'екцый.

Усё большае распаўсюджанне атрымлівае новая тэхналогія саматужнага вырабу апіятаў з насення маку. Гэты спосаб вельмі хутка набыў «папулярнасць» сярод наркаспажыўцоў усіх рэгіёнаў рэспублікі, паколькі як насенне маку, так і пракурсоры для вырабу падобных наркотыкаў знаходзяцца ў свабодным абароце і дзяржаўнаму кантролю не падлягаюць. Пра аб'ёмы нелегальнай вытворчасці наркотыкаў падобным чынам гаворыць факт канфіскацыі ў 2006 годзе на кватэры ў мінчаніна каля 1 тоны маку, прызначанага для рэалізацыі. Цяпер створана міжведамасная рабочая група для абмеркавання і прыняцця рашэння па гэтай праблеме.

Практыка паказвае, што для распаўсюджання наркотыкаў злачынцы ўсё часцей карыстаюцца дасягненнямі сферы высокіх тэхналогій. У Інтэрнэце размяшчаецца падрабязная рэцэптура вырабу наркотыкаў, прапановы аб продажы лабараторнага абсталявання, пракурсораў, наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, месцаў іх збыту. Напрыклад, у сакавіку 2007 года супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролю МУС ліквідавалі лабараторыю па вытворчасці метамфетаміну. Выкарыстоўваючы падрабязную кансультацыю па вытворчасці наркотыку, размешчанай у Сусветнай інфармацыйнай павуціне, злачынцы выраблялі псіхастымулятар нават не выкарыстоўваючы лабараторнае абсталяванне.

Бліжэйшым часам варта чакаць далейшага ўзмацнення дзейнасці па выкарыстанню нашай тэрыторыі для транзітных перавозак наркотыкаў і, як следства, росту нарказатысацыі мясцовага насельніцтва і павелічэння колькасці злачынных дзеянняў у гэтай сферы. Аднак і беларускім праваахоўнікам ёсць што проціпаставіць. Больш жорсткай стала крымінальная адказнасць за збыт наркатычных сродкаў ва ўстановах адукацыі, пенітэнцыярнай сістэме, а таксама месцах правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў. Разглядаецца законапраект па ўвядзенню крымінальнай адказнасці за незаконны абарот некаторых пракурсораў без мэты вырабу наркотыкаў і псіхатропаў. МУС распрацоўваецца і апрабоўваецца сістэма выкарыстання храматографаў для вызначэння месца паходжання наркотыкаў пры наяўнасці іх узораў. Ужо дзейнічае інфармацыйная сістэма «Наркотыкі», якая ўтрымлівае дадзеныя аб проціпраўнай дзейнасці ў сферы іх абароту, а таксама інфармацыйна-пошукавая сістэма «AIPSIN», што дазваляе кантраляваць увоз, вываз і транзіт лекавых сродкаў і пракурсораў, якія ўтрымліваюць наркотыкі. У рамках супрацоўніцтва з ААН падпісаны чарговы этап праграмы Еўрапейскага саюза і ПРААН «Беларуска-ўкраінска-малдаўская праграма па барацьбе з незаконным абаротам і гандлем наркотыкамі». Для атрымання аб'ектыўных звестак і ацэнкі ўзроўню развіцця наркаманіі ў яе рамках на базе Міністэрства аховы здароўя створаны Цэнтр маніторынгу наркотыкаў і іх ужывання. Праводзяцца штогадовыя спецыяльныя праграмы — «Допінг», «Канал» і «Мак», накіраваныя на спыненне ўцечкі з легальнага абароту наркотыкаў, псіхатропных рэчываў і іх пракурсораў, процідзеянне міжнароднаму наркатрафіку і знішчэнне сыравіннай базы наркотыкаў расліннага паходжання. І ўсё гэта — толькі частка арсенала, з дапамогай якога дэмарш «белай смерці» ў Беларусі будзе спынены.

Аляксей ЦІТОЎ,
Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі.

(Аўтар выказвае ўдзячнасць супрацоўнікам Упраўлення па наркакантролю і процідзеянню гандлю людзьмі МУС Беларусі за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу).

**Макадзе — злосны вецер, які нясе смерць (па-японску).*

ЗНАЙСЦІ ЦМОКА

«Знайсці цмока» — з такім дэвізам адправіліся ў падарожжа-экспедыцыю пяць дзяўчат і тры юнакі з розных мінскіх універсітэтаў, аб'яднаных у гісторыка-краязнаўчым таварыстве «Этна». Месца, дзе павінен жыць цмок, было выбрана не проста так. Згодна з паданнем, здаўна пачвары гуртуюцца дзесьці на землях Астравеччыны. Дакладней — у Быстрыцкіх лясах...

ГАЛОПАМ-АЎТАСТОПАМ

«Экспедытары» — людзі творчыя. Таму звыклыя перамяшчэнні па краіне аўтобусам, цягніком ім нецікавыя. Студэнты мне расказалі, што «аўтастоп» дадае экстрыму іх падарожжам, ускладняе даезд да запланаванага месца і разам з тым дае магчымасць пазнаёміцца з новымі цікавымі людзьмі, якія часта становяцца сябрамі «Этны».

У Мінску васьмёрка энтузіястаў раздзялілася — дзвюма парамі і тройкай адправіліся «лавіць цмока». Галіна Філікоп — намеснік старшыні таварыства «Этна» «спадарожкамі» дабіралася з Ліды адна (!). Адважная дзяўчына, ці не так? Вадзіцелі, якія падвозілі незвычайных пасажыраў, як толькі даведваліся, куды і чаго едзе моладзь, казалі, што сваіх дзяцей ў такое падарожжа не пусцілі б. Але, паўтаруся, «этнаўцы» — моладзь незвычайная, таму дажджом, ветрам, нават дваццаціградусным марозам іх не спалохаеш. Дарэчы, вопыт працы па рэстаўрацыі Крэўскага замка ў летнюю спякоту навучыў моладзь пераносіць нягоды непагадзі.

«Сваім ходам» маладыя людзі дабраліся да перакрыжавання Вільнюс—Полацк—Варона—Быстрыца, адтуль да месца — пехатою. Дарэчы, Галіна расказала, што калі ішла праз лес, яе не пакідала думка аб сустрэчы з ваўком. Але мясцовым «шэрым» было не да гасцей — пэўна, маразам са свайго логава не хацелі вылазіць.

Сустрэла «цмокалоўцаў» дырэктар быстрыцкага Дома культуры Соф'я Браніславаўна Дэнюш, якая прадаставіла дах над галавой аматарам таямнічага.

А ДЗЕ ГЭТЫ ЦМОК?

Творчыя асобы доўга не спяць. Пастулат «усё жыццё праспіш» — у іх на першым месцы. Нашы вандроўнікі з рання пайшлі да старажылаў — мясцовых жыхароў — «прабіваць» інфармацыю пра цмока. Дзіва, але пагаварыць на такую пікантную тэму знайшлося нямала ахвотнікаў. Большасць апавядальнікаў расказвалі (на поўным сур'ёзе) пра двух цмокаў — зямнога і нябеснага.

Першы, паводле іх меркавання, з'явіўся прыкладна пяцьсот гадоў таму. Знешні выгляд яго наводзіў жах на ўсіх жыхароў Быстрыцы і суседніх вёсак: чырвоная шурпатая скура, у вачах полымя, язык — нібы лязо, магутныя клыкі, іклы і вострыя даўжэзныя кіпцюры. Жыла пачвара пад зямлёй. Але для таго, каб цмок жыў, яму трэба былі сілы, якія ён высмоктваў з якой-небудзь жывой істоты.

Адзін з жыхароў расказаў «этнаўцам», што калісь нейкі пастух бачыў сваімі вачыма дзіўную рэч. Ён пасвіў кароў. Раптам зямля заварушылася, яркае святло, якое ішло з-пад ног, асляпіла вочы — нічога не было відаць. Рукой пастух засланіў твар, бачыць — карова, нібы падрэзаная, валіцца з ног. Усё раптоўна як пачалося, так і скончылася. Падбег пастух да жывёлы, а на мордзе ў каровы нібы след ад змяінага джала — цмок энергіяй падсілкаваўся.

Цмок меў незвычайныя магчымасці пераўвасабляцца: знойдзе ахвяру дзе-небудзь воддаль, ператворыцца ў стралу, утыркнецца ў цела — няма жывога...

Нябесны цмок — ён іншы. Калі пройдзе дождж, яркімі рознакаляровымі кругамі ён з'яўляецца на небе. Здагадаліся, што гэта? Так, вясёлка.

Сталыя людзі апавядаюць, што калі яны, дзецьмі, любілі хадзіць купацца на рэчку, то бацькі перажывалі за малых: каб тыя не ўтапіліся, гаварылі што над Вяллёй, у небе, жыве цмок, які крадзе малых дзяцей. А калі пасля дажджу над вадой пералівалася вясёлка, гаварылі: «Вось ён, цмок, выйшаў на паляванне...»

Па сёння ў слоўнікавым ужытку жыхароў вёскі Ігнацова, што ля Быстрыцы, няма тэрміну «вясёлка». Як я ні спрабаваў растлумачыць тамтэйшай бабулі, што святло над вадою пасля дажджу называецца вясёлка, для яе гэтая з'ява прыроды — цмок. І ўсё...

Паданні апавядаюць, што вялізныя камяні каля лесу — атрыбут жылля цмока. Студэнты паказвалі мне на лічбавай фотакамеры каля валуноў здымак слядоў, падобных на тыя, якія пакідала пачвара, а таксама запісанае на дыктафон шыпенне, якое выходзіла ад логава . «Ёсць цмок!» — радасна запэўнівалі энтузіясты...

ВЕЧАР ТВОРЧАСЦІ

Толькі вечарам прыемна стомленыя падарожнікі вярнуліся з «паляванння». Менавіта тады далучыліся да іх мы з сябрам. Пазнаёміліся — праз пяць хвілін мне падалося, што гэтых дзівакоў я ведаю ўжо даўно.

Дзяўчаты шліфавалі свой песенны і танцавальны рэпертуар — на заўтра было запланавана выступленне перад быстрыцкімі жыхарамі. Паколькі хлопцаў не хапала, Вольга ўзяла мяне ў танец. Тое, што ногі ў мяне былі падобныя на «вараныя макароны», ніколькі не перашкодзіла пусціцца ў скокі пад «Лявоніху», правальсіраваць пад «Гішпань».

Зманяная вясёлымі танцамі і гульнямі, сталі спяваць песні пад гітару — пра родны кут, радзіму старонку...

У палове другой ночы загучалі вершы — хто якія ведаў, якія ўспомніў. І, здаецца, ніколі б гэты вечар не заканчваўся... Але — напарадзе новы дзень, новыя прыгоды...

301 МЕТР НАД УЗРОЎНЕМ МОРА

«Этнаўцы», па кропельках збіраючы звесткі пра нячысціка, наткнуліся на цікавую гісторыю пра Замкавую гару. Не скарыстаць магчымасці «раскапаць» аб ёй што-небудзь ім проста не дазвалялі «службовы абавязак» і асабістая цікаўнасць. Дарэчы, на трэці дзень экспедыцыі кола аматараў містыкі пашырылася: акрамя нас з сябрам, далучыліся два літоўцы — таямніцы цікавяць усіх.

Мясцовыя жыхары расказалі пра гару тое, што некалькі стагоддзяў таму на ёй стаяў замак, у цэнтры якога знаходзіўся касцёл. Ніхто не ведае гаспадара. У адзін дзень замак разам з усімі пабудовамі праваліўся пад зямлю — можа, ад таго, што цмок рабіў сабе падземныя хады, мяркуюць старажылы. На месцы, дзе стаяў замак, ляжаў вялізны камень, а побач з ім была яма. Кінеш у яе каменьчык — доўга ён ляціць. А праз некалькі соцень метраў стукаецца аб штосьці жалезнае — мабыць, аб крыж касцёла...

Узброіліся мы аповедам жыхароў, тэрмасамі з гарбатай — і адправіліся шукаць дзіва-гару. На шчасце, Алесь Юркойць, які цікавіцца краязнаўствам Астравеччыны, ведаў прыкладнае месцазнаходжанне прадмета паданняў — не давялося нам доўга прадзірацца праз лес. Узняліся «масцітыя» падарожнікі на самы высокі пункт раёна — 301 метр над узроўнем мора — даволі лёгка. На вяршыні нас сустрэлі два сюрпрызы: першы — не зусім прыемны, другі — цікавы. Не знайшлі мы таго каменя, які атаясамліваўся з замкам, ды і яма была завалена нечым ... А можа, я

Дзённік Вікі Ц.

Часам, бывае, сядзіш за камп'ютарам — а ў галаве так пуста і светла, як у акенцы Word. І ніводнай думкі. І жадання працаваць — нуль цэлых нуль дзесятых. «Гэта ўсё спёка», — супакойваюць сябры. Зрэшты, прыступы ляноты можна апраўдаць чым заўгодна — не спёка, дык дождж, або пятніца — апошні працоўны дзень, або «цяжкі» панядзелак... Увогуле, лета ж — а лета, як спявае Міцяеў, «гэта маленькае жыццё» і самая нелагічная пара года.

21.06.2007

Лета з плюсам

Недзе глыбока ў душы я істота аптымістычная, і спрабую ў падзеях бачыць добрае, а потым ужо ўсё астатняе. Бо добра памятаю пра паўшклянкі — для аднаго гэтая шклянка напалову поўная, для другога напалову пустая, розніца толькі ў падыходзе.

Але далёка не ўсё так адназначна, як падаецца ў тэорыі і на паперы. Скажам, холад — гэта добра ці дрэнна? Калі халоднае марожанае — добра. А калі халоднае марожанае ды на хворае горла? Або халодная вада. Як быццам нічога асаблівага. А калі ў вас толькі ўчора на няпэўны тэрмін адключылі гарачую?..

Асабіста ў мяне адносіны з холадам складаныя, мы адзін аднаго недалюбліваем. І наадварот, з павышэннем тэмпературы настрой таксама павышаецца. Прынамсі, у мяне. Многія знаёмыя, наадварот, стогнуць — «ну колькі ж можна гэтай гарачыні, хоць бы адзін градус на мінус пайшоў!». Днямі якраз — не ведаю, хто там рабіў тэрміновы заказ у нябеснай канцылярыі — збылося. І пахаладала, і дажджом зверху паліло як след. Я (аднаго колеру з хмарамі, разумеючы, што персанальнага кліматычнага кантролю ў нас не існуе) прыцягнулася на работу, спадзеючыся, што хоць зараз гэтыя аматары прахалоды задаволеныя жыццём. Ага, зараз жа. Такое адчуванне, што кожны з калег збіраўся выклікаць на дуэль не толькі сіноптыкаў, але за кампанію і нашага пастаяннага «адказнага за надвор'е» карэспандэнта. Ледзьве адбілі. Шляхам асцярожных роспытаў высветлілі, што «так, як было» ўсё ж лепей, чым «тое, што робіцца зараз». Нейкі дзяжурны анёл, відаць, нас пачуў, і лета — нармальнае такое, цёплае і пазітыўнае лета — вярнулася.

Як толькі яно вярнулася, вырашылі з сяброўкамі пасля работы ездзіць купацца — калі не набыць загар, то хоць змыць з сябе офісны пыл. Практычна абсалютнае шчасце, напоўненае аранжавымі захадамі сонца і вадой «а-ля сырадой», доўжылася ўсяго некалькі дзён. А потым у Мінску закрылі для купання ўсе вадаёмы. Літаральна ўсе. Большасці народу гэта, канешне, не перашкаджае паранейшаму плёскацца ў «закрытых» сажалках ці нават у фантанах. Але для нас гэтыя крыніцы пазітыву вычарпаныя, трэба шукаць натхненне ў чымсьці іншым.

Многія лічаць важнейшай складовай шчасця — працу. Не проста працу, як канстытуцыйнае права і высакародны абавязак, а канкрэтную справу, якую ты зрабіў і — ідзі сабе на ўсе чатыры бакі, атрымлівай глыбокае маральнае задавальненне. Але ў тым і штука, што атрымаць задавальненне, скажам, у маім выпадку, можна толькі тады, калі паставіш апошнюю кропку ў тэксце, перачытаеш, не знойдзеш нічога лішняга і выведзеш на друк. І лепш пры гэтым не знаходзіцца ў пастаянным цэйтноце пад з'едлівыя каментарыі кіраўніцтва, што, маўляў, гэта трэба было зрабіць яшчэ ўчора. А калі назаўтра раскрыеш газету і не знойдзеш там сябе, любімага — якое ж тут шчасце, адны перажыванні: і грошай не зарабіў, і час змарнаваў, і ўвогуле — нікому я не патрэбны, ніхто мяне не чытае...

Такія стрэсы паглыбляць нельга, іх трэба перамагаць. Напрыклад, заесці. Але, каб не выклікаць потым новы стрэс («А яшчэ я тоўста-ая...»), лепш заядаць чымсьці смачным і карысным. Балазе, летам з гэтым праблем няма. Свежая гародніна, зяленіва, ягады... Во, ягады! Суніцы, клубніцы, чарэшні, — смаката! Вітаміны напалам з пазітывам. І з агаворкай «але». Бо калі ў цябе над душой стаяць і спрабуюць скарміць паўтара кілаграма чарэшні: «Скушай, доченька, яйцо диетическое!» — потым можа ўвогуле не захочацца нават глядзець на тыя вітаміны. Як жартуе мая знаёмая, пачуццё меры прыходзіць з пяціхвілінным спазненнем і потым адгукаецца з паўгода.

Можа, падсілкоўваць сябе марамі пра адпачынак? Водпуск... Водпуск — гэта добра. Якое там добра, гэта класна! Схіляю галаву перад усімі ўпартымі працаголікамі, але адмаўляцца ад законнага адпачынку не стану — зарабіла. Водпуск — гэта магчымасць патраціць назапашаныя грошы не проста так, неўпрыкмет, а мэтанакіравана і з задавальненнем: на мора, сонца, новы купальнік, вандроўкі і пасядзелкі з сябрамі. І ўсё гэта добра, але... Але не хутка. І каб не прыпаўзці да яго зусім разбітай і разраджанай на мінус, як старая батарэйка, я шукаю «плюсы». Цвіце акацыя — добра (у мяне ж алергіі няма). Раве ўвечары дрыль у суседа — выдатна (а мог бы і ў выхадныя зранку!). Электрычнасць вырубілі — цудоўна (а інакш нашто мне падораныя араматычныя свечкі?). І гэтак далей, далей, далей... Чаго і вам жадаю.

Сітуацыя

ЗАЧЫНІЦЬ НЕЛЬГА ПАКІНУЦЬ

Спачатку быў тэлефонны званок, а затым — і калектыўнае пісьмо. Ад бацькоў, дзеці якіх наведваюць спецыяльную ўстанову для непаўналетніх інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця па вуліцы Міхася Лынькова, 39 у сталіцы. Нагода для зваротаў адна і тая ж: просьба дапамагчы захаваць установу. Інакш кажучы, прадаставіць шанц дзецям са страшнымі дыягназамі не заставацца дома. А самім бацькам — даць магчымасць працаваць.

Замест інтэрната... «садок»

Першымі ідэю падобнай установы сталі выказваць менавіта бацькі, якія вырашылі адмовіцца ад змяшчэння сваіх дзяцей у дом-інтэрнат. Задумка падалася вартай. Так, у лютым 1994 года было прынята станоўчае рашэнне гарвыканкама. Налета ўдалося «падшукаць» двухпавярховы будынак колішняга дзіцячага садка. Потым быў капітальны рамонт. А 1 чэрвеня 1998 года стала днём пачатку работы Спецыяльнай установы для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

— Сёння да нас прыходзяць 38 дзяцей і падлеткаў адразу з некалькіх раёнаў сталіцы, — распавядае дырэктар установы Валерый Генадзьевіч Сіўцоў. — Прычым старэйшаму выхаванцу ўжо амаль 18, а малодшаму — усяго 4 гады. Аднак усіх іх аб'ядноўвае адно — цяжкія хваробы. Гэта і праблемы з інтэлектуальным развіццём, слыхам, зрокам, маўленнем, і ранні дзіцячы аўтызм, і значныя парушэнні апорна-рухальнага апарату.

Вонкава тут усё нагадвае дзіцячы садок ці школьную групу падоўжанага дня. Пляцоўка для гульняў, музычная зала, некалькі невялікіх спальных і безліч цацак. Са «стандартнага» малюнка выбіваюцца хіба што пандусы на лесвіцах. А таксама... абсталяваныя пакоі дэфектолагаў.

— У спецыяльнай установе працуюць не толькі дэфектолагі, але і выхавальнікі, педагог-псіхолаг, музычны кіраўнік, інструктар лячэбнай фізкультуры, прычым у нас з'явіліся па сутнасці свае падыходы, — адзначае Валерый Сіўцоў. — Спачатку на кожнае дзіця запаўняецца спецыяльная карта па некалькіх пазіцыях — самаабслугоўванне, маторыка, камунікатыўныя здольнасці, сацыяльная адаптацыя, гульня, знаёмства з навакольным светам. А потым па кожным з гэтых накірункаў пачынаецца індывідуальная работа. І паступова, падчас паўторных запаўненняў, мы часцяком канстатуем пэўнае паляпшэнне сітуацыі. Зразумела, поспехі ва ўсіх розныя: калі адны вучацца проста нармальна жаваць ежу, то іншыя могуць зрабіць бутэрброд ці заварыць гарбату. Разам з тым варта заўважыць: пакрысе гэтыя няхітрыя навыкі замацоўваюцца, а значыць — застаюцца на ўсё жыццё. У выніку ж дзеці пачынаюць проста верыць у свае сілы.

Тым часам існуе яшчэ адзін і не менш значны «плюс». Установа працуе з панядзелка па пятніцу ў найбольш «зручным» рэжыме — з 7 да 19 гадзін. Плюс да таго тут ёсць уласны аўтобус, што дазваляе цалкам вырашыць усе праблемы з падвозам. У сваю чаргу гэта дае магчымасць бацькам вярнуцца да звычайнага, паўнавартаснага жыцця. І ў тым ліку — уладкавацца на работу.

Зносіны. Плюс праца

Пісьмо, пад якім падпісаліся Кацярына Сямёнава, Марына Клыгіна, Уладзімір Колбік і іншыя бацькі выхаванцаў спецыяльнай установы, аказалася вялікім і, магчыма, месцамі — даволі эмацыянальным. Тым не менш дазволім сабе працытаваць некалькі яго ўрыўкаў. Прынамсі, для таго, каб мець уяўленне аб сутнасці самой праблемы.

«Не ў першы раз мы, бацькі дзяцей-інвалідаў, што наведваюць сацыяльную ўстанову па Лынькова, 39, звяртаемся з просьбай захаваць яе ў цяперашнім статусе і ў цяперашнім рэжыме работы. І не першы год «адказныя» работнікі плануюць установу пераарыентаваць, расфарміраваць, зачыніць.

Летась у чэрвені на калектыўныя пісьмы бацькоў, што былі накіраваныя ў розныя выканаўчыя органы з просьбай не адварочвацца ад нашай бяды і праявіць да нашых дзяцей міласэрнасць, мы атрымалі афіцыйны адказ, што работа «Спецыяльнай установы для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця працягнута яшчэ на год». Год прайшоў. І сітуацыя паўтараецца.

Мы зноў задаём пытанне: што будзе заўтра? Бо цалкам зразумела, з закрыццём нашага «другога дома» мы аказваемся ў ізаляцыі, кожны сам-насам са сваім горам. А нашы дзеці будуць пазбаўлены таго малога, што у іх ёсць — магчымасці зносінаў паміж сабой і з іншымі людзьмі, што клапоцяцца аб іх зараз: выхавальнікамі, дэфектолагамі, нянечкамі, педагогамі па фізічнаму і эстэтычнаму развіццю. Дарэчы, за ўсе гады існавання гэтай установы ў адрас яе работнікаў не было ніводнай афіцыйнай скаргі, ніводнага наракання. Нягледзячы на невялікія зарплаты, тут сфарміраваны пастаянны штат прафесіяналаў. Дык навошта сёння трэба ўсё разбураць?

На наш погляд, закрыццё спецыяльнай установы для дзяцей-інвалідаў па Лынькова, 39 прывядзе да таго, што маці, многія з якіх займаюцца выхаваннем адны, проста будуць вымушаныя пайсці з работы і жыць выключна на дапамогу і пенсію па інваліднасці, што складаюць у суме каля 290 тыс. рублёў. Пры гэтым варта заўважыць, што якіх-небудзь ільгот па квартплаце, аплаце электраэнергіі, газу, вады такія сем'і не маюць. Вось толькі ці магчыма пражыць на такія грошы ўдваіх з дзіцем? Мы думаем, адказ вы ведаеце самі...»

Усіх. Або старэйшых?

Кажучы шчыра, версій падзей, што апошнім часам разгортваюцца вакол установы, давялося пачуць нямала. Паводле адной з іх, «уся справа ў сродках». Версія нумар два — спроба правесці перараспеціялізацыю і такім чынам крыху згладзіць хранічную для Мінска праблему з дэфіцытам месцаў у дамах-інтэрнатах для псіханеўралагічных хворых. Нарэшце, у якасці трэцяй з магчымых прычын называецца адсутнасць... дакладнага статуса. Палажэнні, штатныя расклады, умовы аплаты працы па тых жа дамах-інтэрнатах распрацаваны вельмі даўно. Па ў нечым унікальнай установе па Лынькова, 39 усяго гэтага няма. Прычым узгаданы пакет дакументаў — падстава для фінансавання. Між тым, не сакрэт: патрабаванні да бюджэтных выдаткаў становяцца ўсё больш жорсткімі.

Як бы там ні было, галоўнае ў іншым. Як паведамілі ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, сама ўстанова зачыняцца не будзе. Яе плануецца перапрафіляваць у дом-інтэрнат. Пры гэтым у ім ёсць намер стварыць аддзяленне кругласутачнага і дзённага знаходжання — для цяперашніх наведвальнікаў спецыяльнай установы... Праўда, пакуль тут розныя бакі кажуць аб зноў-такі розных варыянтах. Паводле першага, у аддзяленні змогуць застацца ўсе выхаванцы без выключэння. Паводле ж другога — толькі дзеці ва ўзросце больш за 14 гадоў. Тады як астатніх накіруюць у цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі розных раёнаў сталіцы. Аднак якраз наконт цэнтраў бацькі выказваюць значныя сумненні. І называюць свае аргументы. Так, не сакрэт: звычайна цэнтры працуюць у менш працяглым рэжыме — з 8 да 17 гадзін.

Далей. У выпадку «пераводу» знікне магчымасць цэнтралізаванага падвозу, тады як карыстацца грамадскім транспартам, і асабліва ў «гадзіну-пік» гэтыя дзеці не ў стане. Апроч таго, многія занепакоеныя і такой акалічнасцю. Значная частка цяперашніх наведвальнікаў не можа самастойна прымаць ежу, большасць не абыходзіцца без памперсаў. Адсюль ёсць верагоднасць паступовага пераходу на надомнае навучанне. У выніку дзеці будуць заставацца дома. А іх бацькі — звальняцца...

Зрэшты, варта падкрэсліць адразу, што пакуль выпадае весці гаворку менавіта аб версіях і варыянтах. Канчаткова лёс спецыялізаванай установы павінен вырашыцца да 1 верасня. Таму час на роздум яшчэ ёсць. Праўда, час зусім не вялікі.

Сяргей ГРЫБ.

«БРОНЗА» ПЛЮС «СЕРАБРО»

Пераможцы XVIII рэспубліканскага конкурсу навуковых біёлага-экалагічных работ, які праводзіцца сярод навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў і выхаванцаў устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, паспяхова выступілі на XV Міжнароднай алімпіядзе экалагічных праектаў, якая прайшла ў Стамбуле (Турцыя).

Так, Андрэй Пракошын — выхаванец Віцебскага абласнога аб'яднання па арганізацыі пазашкольнай работы — заваяваў у Турцыі сярэбраны медаль, а Вераніка Фацеева — выхаванка Цэнтра юных натуралістаў г. Салігорска — бронзавую ўзнагароду. Усяго ў Міжнароднай алімпіядзе экалагічных праектаў прымалі ўдзел каманды юных эколагаў з больш чым 40 краін свету.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БУДАТРАДЫ І ТУТ, І ТАМ

На Гомельшчыне ў гэтым працоўным семестры іх створана 120, яны аб'ядноўваюць каля шасці тысяч студэнтаў і школьнікаў.

Некалькі будатрадаў працуе ўжо ў Туапсэ на Усерасійскім дзіцячым цэнтры «Арляня» і ў Анапе ў лагеры «Жамчужына Расіі». Акрамя таго, будатрады будуць занятыя на розных аб'ектах вобласці і рэспублікі пасля таго, як закончацца экзамены ў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Салон прыгажосці

Калі хочацца піць...

Каб захаваць маладосць, чалавеку неабходна піць шмат вадкасці (да 3 літраў у дзень), асабліва актуальна гэта, калі на вуліцы +30. Вучоныя, дарэчы, падлічылі, што пры страце 1 літра вадкасці нас пачынае мучыць смага, 2 літраў — зніжаецца разумовая дзейнасць, 3 літраў — магчыма страта прытомнасці і сардэчныя прыступы. Прыблізна на трэць недахват вадкасці могуць запоўніць сабой розныя прадукты харчавання — супы, садавіна, агародніна і інш., а на дзве трэці — напоі. Звычайна арганізм чалавека выпарае 2—2,5 л вільгаці ў суткі, але ў спякотнае надвор'е і пры фізічных нагрузках «уцечка» даходзіць да 4 л...

Такім чынам, што мы п'ём?

Чай

На думку вучоных, гэта — найлепшы сродак для наталення смагі. І не мае значэння, халодны ён, гарачы або цёплы. На карысць зялёнага чаю гаворыць высокае ўтрыманне ў ім вітаміну Р, які спрыяльна ўздзейнічае на сасуды, лягчэй п'ецца, не пакідае жаўцізны на зубах. А вось чорны чай лепш танізуе. У адной шклянцы як таго, так і другога чаю ўтрымліваецца 12—15 мг флаваноідаў, якія з'яўляюцца выдатным сродкам прафілактыкі раку і сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Сакрэт. Гарачы зялёны чай здольны абараніць скуру ад ультрафіялетавых промняў, але не рэкамендуецца больш як 8 кубачкаў у дзень.

Вада

Самы распаўсюджаны і недарагі напой. Па здольнасці наталяць смагу з-за вялікай колькасці соляў і біялагічна актыўных рэчываў халаднаватая мінералка займае другое месца пасля чаю. Яна выдатна асвяжае, стымулюе апетыт і нават знімае стому. Калі ў вас няма гастрыту ці язвы страўніка, аддавайце перавагу газаванай мінеральнай вадзе. Вуглекіслата яе выклікае слінавыдзяленне, што дапамагае, сярод іншага, стравайванню і паспяхова перамагае смагу.

Сакрэт. Наталіць смагу дапамогуць і долькі лімона, кінутыя ў звычайную ваду, ці некалькі кіслых ягад — брусніц ці журавін. Каб вадкасць затрымалася ў арганізме, у склад чаю, соку ці газаванай вады павінны ўваходзіць арганічныя кіслоты і мінералы, бо сэнс наталення смагі — не ў тым, каб прыняць як мага больш вадкасці, а ў аднаўленні сілы і папаўненні запасу соляў, якіх пазбавіўся наш арганізм разам з потам.

Не рэкамендуецца. Піць ваду з-пад крана, вельмі халодную і дыстыляваную ваду.

Газаваныя напоі

У адной бутэльцы «пэпсі-колы» ёмістасцю 0,33 літра ўтрымліваецца прыблізна 8 кавалачкаў цукру, у «кока-коле» — 6, што ў перараразліку на калорыі дае 190 і 140 ккал адпаведна. Як бачым, галоўныя складовыя гэтых напояў — цукар, а таксама кіслата — не такія ўжо і бяскрыўдныя для здароўя чалавека.

Калорыі, якія лёгка засвойваюцца, застаюцца незаўважанымі, памяншаюць пачуццё голаду, але адбіваюцца на таліі. Таму людзям, які маюць схільнасць да паўнаты, а таксама да цукровага дыябету, трэба наперш уважліва вывучыць этыкетку. Акрамя гэтых праблем, салодкія газаваныя напоі спрыяюць развіццю карыесу, а кіслата, якая ў іх утрымліваецца, вымывае кальцый з касцей, што можа прывесці да астэапарозу і іншага кальцыядэфіцытнага стану.

Яшчэ адзін абавязковы інгрэдыент любога ліманаду — вуглякіслы газ. Сам па сабе ён бяскшкодны, але яго прысутнасць у вадзе ўзбуджае страўнікавую сакрэцыю, павышае кіслотнасць страўнікавага соку, правакуе метэарызм. Улічваючы ўсе гэтыя фактары, не трэба захапляцца салодкімі газаванымі напоямі і асабліва важна — не даваць у вялікай колькасці іх дзецям.

Не рэкамендуецца. Людзям, якія маюць язвавую хваробу страўніка, гастрыт з павышанай кіслотнасцю і іншыя захворванні страўніка і кішэчніка. Перад ужываннем газаваных напояў трэба выпусціць газ з бутэлькі.

Сокі і нектары

Летам у спякоту добра дапамагаюць таматны, вішнёвы, грэйпфрутавы, слівавы, алычовы сокі, а вось сокі з мякаццю, а таксама змешаныя сокі наталяюць смагу значна горш. Аднак апошнія ўтрымліваюць яшчэ і клятчатку, пекцін, тлушчарастваральныя вітаміны, таму іх харчовая каштоўнасць вышэйшая.

Сакрэт. У спякотнае надвор'е найлепш піць разбаўлены сок. Справа ў тым, што ізатанічныя (блізкія па канцэнтрацыі да плазмы крыві) напоі хутчэй усмоктваюцца і прыносяць палёгку.

Не рэкамендуецца. Сок, прыгатаваны з сухога канцэнтрату.

Кісламалочныя прадукты

Кефір, ражанка, ёгурт, кіслае малако — прадукты, якія ўключаюць у сябе арганічныя кіслоты, таму яны выдатна спраўляюцца са смагай. Да таго ж, яны хутка засвойваюцца (за гадзіну — больш як на 90 працэнтаў; у той час як малако, напрыклад, толькі на 30 працэнтаў). Некаторыя з іх (біфідакефір, біфідок) дапамагаюць аднавіць нармальны састаў мікрафлоры кішэчніка. Кіслае малако ўсіх відаў можна есці з салодкай садавіной, ягадамі.

Сакрэт. У працэсе браджэння лактоза ператвараецца ў малочную кіслату, таму кісламалочныя прадукты падыходзяць людзям, якія маюць індывідуальную непераноснасць малочнага цукру.

Малако

Калі тэмпература «за бортам» перавысіла ўсе магчымыя межы, выпіце шклянку абястлушчанага малака (ці — цэльнага, разбаўленага вадой). Яно (пры рэгулярным ужыванні) зніме стрэс, папярэдзіць астэапароз (хваробу, якая прыводзіць да крохкасці касцей), рак грудзей, знізіць ціск крыві.

Сакрэт. Чай з малаком — танізуючы напой, спрыяльна ўздзейнічае на слізістую абалонку страўніка.

Не рэкамендуецца. Піць малако пасля яды, бо яно зніжае сакрэцыю страўнікавага соку.

Квас

Напой карысны, выдатна наталяе смагу. Ён быў вядомы і папулярны са старажытных часоў — медыкі мінулых стагоддзяў звярнулі на яго ўвагу, і яшчэ ў XVIII стагоддзі квас абавязкова прымяняўся ў шпітальных рацыёнах. Вялікім аматарам і папулярызатарам квасу быў Дз. Мендзялееў. У народнай медыцыне квас выкарыстоўваўся пры ліхаманцы, прастудзе, як мачагонны і слабіцельны сродак. І сапраўды, хлебны квас рэгулюе дзейнасць страваральнага тракту, перашкаджае размнажэнню шкодных і хваробатворных мікробаў, павышае тонус, паляпшае абмен рэчываў і спрыяльна ўплывае на сардэчную дзейнасць. Карысныя ўласцівасці хлебнага квасу абумоўлены экстрактыўнымі і водарнымі рэчывамі, якія ўтвараюцца ў ім на розных этапах яго прыгатавання — настойвання, браджэння і г.д. Квас — спажыўны і карысны напой, у ім утрымліваюцца вугляводы, бялкі, вітаміны Е, С, групы В, мінеральныя солі — кальцыю, магнію, фосфару, марганцу. Дрожджы, малочнакіслыя бактэрыі абагачаюць яго вітамінамі РР, D, малочнай кіслатой, таму ён такі смачны і так выдатна асвяжае.

Сакрэт. Пры рэгулярным ужыванні квас паляпшае работу нервовай сістэмы.

Не рэкамендуецца. Піць газаваны квас, што прадаецца ў бутэльках. Дабаўкі харчовых фарбавальнікаў, падсалоджвальнікаў, лімоннай, сарбінавай і бензойнай кіслот ператвараюць яго ў звычайны ліманад, які толькі аддалена нагадвае па смаку першапачатковы прадукт.

Піва

На жаль, любімае многімі піва ўтрымлівае алкаголь, а таму больш за пару бутэлек у дзень — гэта перабор. Справа нават не ў піўным алкагалізме, а ў тым, што спіртныя напоі не могуць паўнавартасна запоўніць страту вады. Акрамя таго, піва каларыйнае, а значыць, не падыходзіць тым, хто сочыць за фігурай.

Сакрэт. Чэшскія і нямецкія ўрачы сцвярджаюць: у невялікай колькасці (не больш за 1 л у дзень) піва зніжае рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў, станоўча ўздзейнічае на ныркі, папярэджвае ўзнікненне камянёў, павышае імунітэт арганізма.

Не рэкамендуецца. Больш як 1 літр напою ў дзень.

Кампот

Калі быць дакладным, кампот адносіцца не да напояў, а да салодкіх дэсертных страў, бо самае спажыўнае ў ім — не вадкасць, а ягады ці садавіна. Смаганаталяльныя ўласцівасці кампоту даволі нізкія — за кошт таго, што цукру ў ім больш, чым арганічных кіслот і мінеральных соляў.

Сакрэт. Калі ў спякотны дзень вы вырашылі выпіць халоднага кампоту, развядзіце яго невялікай колькасцю вады і дабаўце туды чырвонага сухога віна (з разліку 1 шклянка на 3 л кампоту).

Не рэкамендуецца. Піць ледзяны кампот.

Анастасія ФАНДО.

ВЕДЫ ПА ЎЛАСНАМУ ЖАДАННЮ

Сучасныя патрабаванні пры прыёме на працу даволі жорсткія. Яно і зразумела: работадаўца мяркуе атрымаць патрэбнага спецыяліста з пэўнай кваліфікацыяй. Тут усё, у рэшце рэшт, залежыць ад узроўню ведаў, таму да «дарослага жыцця» дзяцей пачынаюць сур'ёзна рыхтаваць ледзьве не з дзіцячага садка. Выбар навучальнай установы — справа няпростая, звычайна ўлетку гэтае пытанне набывае асаблівую актуальнасць. Вядома, кожны з бацькоў жадае, каб іх дзіця атрымала трывалыя веды на сучасным узроўні. Для гэтага ў цэнтральным рэгіёне імкнуцца стварыць усе належныя ўмовы. Як адзначаюць ва ўпраўленні адукацыі Мінскага аблвыканкама, зараз параўнанне адукацыйных магчымасцяў у раёнах далёка не заўсёды схіляецца на карысць той жа сталіцы. Каб пераканацца ў гэтым, завітаў у Валожын. Якія тут для бацькоў і дзяцей існуюць прапановы?

У раённым цэнтры працуе дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці «Расінка» — вельмі цікавая ўстанова. Спачатку гэта быў звычайны садок (утвораны ў 1983-м), а новы статус установа атрымала пазалетась. Зараз тут 130 выхаванцаў, працуюць сем груп.

— Акрамя ўсяго іншага мы прапаноўваем шэраг дадатковых паслуг, — заўважае дырэктар цэнтра Валянціна Залеская, — сярод якіх — заняткі па нямецкай і англійскай мовах (навучанне праводзіцца пачынаючы з пяці гадоў), харэаграфіі. Працуе студыя харэаграфіі, фальклорны гурток «Вянок», дзіцячы аркестр. Кожны зможа знайсці сабе занятак па душы. Адкрыты дзве санаторныя групы, дзе прапаноўваюцца лячэбна-аздараўленчыя, медыцынскія паслугі — інгаляцыі, ароматэрапія, імунатэрапія, тубуснае апраменьванне носаглоткі і інш. З улікам груп здароўя праводзяцца спартыўныя заняткі, нават працуе гурток дзіцячага баскетбола.

Адна з адметнасцяў цэнтра — увасабленне экацэнтрычнай сістэмы выхавання. Кажучы прасцей, дзяцей з самага ранняга ўзросту вучаць адчуваць сябе часцінкай прыроды, з якой чалавек павінен існаваць у гарманічным узаемадзеянні. Вось ужо дзесяць гадоў «Расінка» з'яўляецца ў раёне базавай установай па экалагічнаму выхаванню дашкольнікаў, тут працуе адпаведная абласная інавацыйная пляцоўка. На навакольнай тэрыторыі створаны самы сапраўдны музей пад адкрытым небам. Кожны з участкаў замацаваны за пэўнай групай, дзеці старанна даглядаюць «свае» палеткі. Як кажа Валянціна Залеская, яны гуляюць і працуюць, усё тое харастро малыя разам з педагогамі стварылі ўласнымі рукамі. А зрабіць давялося шмат — справа ў тым, што тутэйшая глеба даволі «праблемная» (пясок, гліна, камяні) і вельмі складана нешта вырасціць. Вакол цэнтра зараз самы сапраўдны фруктовы сад (паўсотні дрэў), а таксама шмат іншых раслін. Ёсць нават «інсталяцыя» самага сапраўднага беларускага падворка — з калодзежам, драбінамі і плеценым плотам. Дзеці павінны ведаць свае карані — так тут лічаць.

А ў Валожынскай гімназіі, куды выпускнікі «Расінкі» звычайна і паступаюць, экалагічны і этнаграфічны накірункі лагічна працягваюцца. Зразумела, на іншым узроўні. Тут ёсць свая традыцыя: першакласнікам звычайна прапануюць прайсці «слядамі шчасця». Увогуле ж адмысловая кампазіцыя мае назву «У нагу з часам» — гэта такія вялікія сляды. Настаўнікі перакананыя, што калі дзеці загадаюць нейкае жаданне, то варта сюды ступіць і яно абавязкова збудзецца. Мабыць, так яно і ёсць, бо па слядах ходзяць не толькі першаклашкі.

Валожынская гімназія ўжо прайшла дзве спецыяльныя атэстацыі і з гонарам пацвердзіла свой высокі статус. Па выніках мінулага года яна прызнана лепшай у раёне ўстановай адукацыі. А па вобласці ўваходзіць у дзесятку лепшых гімназій. І яно сапраўды так — тут практыкуецца шматпрофільнае навучанне.

— Вучні набываюць веды па ўласнаму жаданню — можна выбраць патрэбны профіль, — кажа дырэктар Валожынскай гімназіі Валянціна Чарнышова. — З першага класа дзеці вывучаюць замежную мову, а з пятага — яшчэ адну. У 11 класе мультыпрофільнае навучанне. Такі падыход вельмі плённы: больш чым 70 працэнтаў выпускнікоў паступаюць у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

І яшчэ адзін, на мой погляд, вельмі цікавы факт: у гімназіі з мінулага года выпускаюць свой часопіс «Каўчэг». Дзеці актыўна ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы разнастайных матэрыялаў, рэпартажаў аб жыцці гімназістаў. Летась «Каўчэг» заняў другое месца ў рэспубліканскім конкурсе школьнай прэсы. Так што адукацыйныя магчымасці ў валожынскай дзятвы вялікія, галоўнае — было б жаданне.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Валожынскі раён.

НА ЗДЫМКУ: на «вясковым падворку» заўсёды шмат дзятвы.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасу **220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, мікрахвалевую печ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 2 ліпеня 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **5 ліпеня 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 17 ліпеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 верасня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года і пашпарта. Дастаўку печы СВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 5 чэрвеня 2007 года. Удачы ў гульні!

6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на III кв. або II паўгоддзе 2007 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі | _____ руб. | Колькасць камплектаў

пераадрасоўкі | _____ руб.

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

«КРЫЁН-АГРА»: ТАК ТРЫМАЦЬ І ДАЛЕЙ!

— Ну, так добра гэты год пачалі. І пасеялі ў самы сцісłы тэрмін, і ўсё па агратэхніцы... Добрага ўраджаю чакалі. Але засушыла, выпаліла палеткі. Вось і будзь багатым...

Гэтыя словы гаварыла начальнік планава-эканамічнага аддзела гаспадаркі «Крыён-Агра» (Дзяржынскі раён) Ала Якубоўская. І сапраўды, нямала дзе вельмі сумную карціну ўяўлялі палеткі гаспадаркі, на якіх зялёныя пасевы чаргаваліся з вялізнымі жоўтымі плямамі нізкарослых выгаралых раслін. Ім ужо не парадаваць сельскага працаўніка важкім коласам. Пры гэтым асабліва дасталася ячменю. А ў «Крыёне-Агра» разлічвалі ўзяць сёлета па 35 цэнтнераў з гектара. Можа, для каго іншага гэта і не паказчык, а для гаспадаркі «Крыён-Агра» — вельмі добра. Бальнасць зямлі тут, або яе ўрадлівасць, на самым нізкім, крытычным узроўні — 25 балаў пры сярэдняй па раёну 36. Працаўнікі «Крыёна-Агра» нават называюць свае мясціны анамальнымі. Калі і прайшоў дождж — усё, як у пясок. Прычым менавіта так і атрымліваецца — глебы тут амаль скрозь пясчаныя. А тут яшчэ і таго дажджу не дачакацца, і прыпякло гэтак. Аднак як залежыць наш сельскі працаўнік ад надвор'я, і як часта бываюць далёкія ад яго летніх клопатаў і трывог многія з нас, гараджан, для каго, можа, і тое ж пякельнае сонца толькі ў радасць...

Такім чынам, наш расказ — пра сённяшнія справы і клопаты гаспадаркі «Крыён-Агра» (ці больш правільна — філіяла «Крыён-Агра»), у якую мы адправіліся разам з намеснікам мінскага прадпрыемства «Крыён» Уладзімірам Давідзюком. Удакладнім: гэта менавіта філіял мінскага «Крыёна», да якога некалі і далучылі сельскагаспадарчае прадпрыемства з Дзяржынскага раёна. Чаму далучылі, зразумела — гэтаму сельскагаспадарчаму прадпрыемству спатрэбіўся надзейны «буксір». На «Крыёне» ў выніку да сваёй асноўнай дзейнасці, якая заключаецца ў атрыманні і пастаўцы шматлікім спажыўцам прадуктаў раздзялення паветра — азоту, кісларoду і аргону, дадалі і клопаты пра ўраджай, а таксама пра малако ды мяса. Адразу ж падкрэслім: у выніку пэўных арганізацыйных захадаў, а таксама капітальных укладанняў (пры гэтым немалых: за ўвесь час на «Крыёне» ўклалі ў свой аграфіліял каля 5 мільярдаў рублёў), справы ў былым занядбаным сельскагаспадарчым прадпрыемстве пайшлі на добры ўздым. Напрыклад, нямала пра што гаварыць ужо такія факты: у мінулым годзе філіял «Крыён-Агра» заняў першае месца ў раёне (з разліку на бала-гектар) па вытворчасці малака; ён цяпер займае другую пазіцыю ў раёне па шчыльнасці жывёлы на 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў. У гаспадарцы істотна абнавілі парк сельскагаспадарчай тэхнікі, у якім цяпер ёсць нават «Джон Дзір» (найперш дзякуючы яму, адзначаюць тут, сёлета гэтак добра адсеяліся), тут сталі максімальна падрыхтаванымі сустракаць сельскагаспадарчыя сезонныя кампаніі, увогуле больш адказна ставіцца да справы.

Ва ўсім гэтым знайшліся і добрыя энтузіясты. Асноўны ўхіл у гаспадарцы зрабілі на вытворчасць малака і мяса, пры гэтым вытворчасць мяса пераважна заснавана на развіцці свінагадоўлі.

Безумоўна, найгалоўнейшы ініцыятар і спецыяліст ва ўсёй гэтай справе — загадчык фермы Міхаіл Макарэвіч. Дарэчы, чаму «фермы»? Загадчык фермаў — у Міхаіла Макарэвіча іх тры: два адкормачнікі і ферма матачнага пагалоўя. Два гады таму ён і ўзяўся разгарнуць усю справу. Практычна, як адзначаюць у гаспадарцы, пачаў з нуля. У ёй на той час было 200 галоў, цяпер жа — 1300.

— Калі пачыналі, то многія сумняваліся, што справа пойдзе. Трэба было пераабсталёўваць, прыстасоўваць старыя жывёлагадоўчыя памяшканні, наладжваць кармленне, прычым згодна з новымі тэхналогіямі, і г.д. Па сутнасці, гэта была зусім новая для нас справа, прычым трэба было ўжо ў хуткім часе давесці колькасць пагалоўя не меней чым да тысячы. Толькі тады гэта справа была вартая таго, каб можна было ёй займацца, эфектыўна займацца, каб быў прыбытак. Увогуле, калі пачыналі, прыязджалі да нас спецыялісты з раёна, і раённы галоўны ветурач пра наша памяшканне, якое мы прыстасавалі для вырошчвання ў ім свіней, сказаў: маўляў, варта было б знесці яго, забетанаваць гэта месца ды і забыцца пра ўсё. А я тады адказаў: «А час пакажа», — расказваў Міхаіл Макарэвіч. — І вось, калі ласка, у нас цяпер для свіней і «шведскі» стол, і найбольш прыемныя рацыёны, і іншыя зручнасці — толькі і ведайце, што нагульвайце для гаспадаркі добрае мяса...

Пра тое, як ставіцца да сваёй справы Міхаіл Макарэвіч, пэўным чынам сведчыць такі факт: фермы ў гаспадарцы раскіданыя адна ад адной на многія кіламетры, а не шкодзіць штодня наведаць кожную з іх. Наведвае. На сваёй уласнай машыне. Прычым выдзяляюць яму для гэтых паездак 70 літраў бензіну (ліміт) — спальвае намнога больш, але ўжо астатняе пакрывае за кошт уласных сродкаў. Нехта, маючы на ўвазе асобныя тонкасці стаўлення ў вёсцы да сваёй і да калектыўнай уласнасці, можа сказаць: «Дзівак». А ён сапраўды даволі цікавы чалавек. Ён, напэўна, змог бы напісаць пра сваю справу цэлую дысертацыю. Дарэчы, вось адно з яго меркаванняў: калі чалавек на ўласным падворку не можа курыцу выгадаваць, дык няма яму чаго і рабіць у жывёлагадоўлі. Пытаюся ў Міхаіла Макарэвіча: «А ў вас не абкрадваюць жывёлу, як гэта, не сакрэт, часам бывае ў некаторых іншых гаспадарках?». Адказвае: «А навошта тады загадчык фермы? Увогуле, трэба рабіць сваю справу ад душы, тады і дурных думак не будзе, і вынік будзе».

Вынік, сапраўды, ёсць. І вельмі неблагі. Ад свайго немалога пагалоўя ў філіяле штомесяц атрымліваюць каля 20 тон мяса. Дакладней, могуць атрымліваць. Вось, аказваецца, закавыка: навучыліся ў «Крыёне-Агра» вырошчваць добрых свіней, дабіліся высокіх прываг (штосутачна каля 540 грамаў), і раптам на табе — праблемы са збытам. Гэтыя праблемы з'явіліся сёлета і збіваюць з рытму ўвесь адкормачны канвеер. «Перанасычэнне айчыннага рынку свінінай адбылося, яна завісае», — каментуе сітуацыю Міхаіл Макарэвіч. Можа, і так. Праўда, шчыра сказаць, многія нашы грамадзяне не так ужо і перанасычаюцца мяснымі прадуктамі. Але гэта ўжо іншае пытанне, і яно менш за ўсё датычыцца Міхаіла Макарэвіча і яго справы.

У заключэнне гэтай тэмы варта сказаць пра звышзадачу Міхаіла Макарэвіча — атрымліваць ад кожнай свінаматкі свайго немалога матачнага пагалоўя па 10 парасят. Звычайна, як зазначаў сам Макарэвіч, 9 — гэта ўжо вялікае дасягненне.

«Крыён-Агра», як зразумела ўжо са сказанага вышэй, няблага рушыў наперад і ў вытворчасці малака. Тут немалы малочны статак, у ім 710 кароў, ад кожнай з іх у гаспадарцы надойваюць больш за 16 літраў, прычым з прыбаўкай да мінулага года. Каб не «згубіць» малако падчас сёлетняй спёкі (пашы таксама выгараюць, травы страчваюць сваю сакавітасць), тут арганізавалі падкормку жывёлы, у яе рацыён увялі пратэін. Як зазначыў намеснік дырэктара філіяла па жывёлагадоўлі Аляксандр Сіняк, статак у ім за апошні год істотна, на 38 працэнтаў, амаладзіліся. Сёлета ў гаспадарцы паставілі задачу надаіць ад каровы па 5640 кілаграмаў; у мінулым годзе было 4782.

Каб мець добрае малако круглы год, у «Крыёне-Агра» цяпер пасапраўднаму клапоцяцца і пра нарыхтоўку кармоў. Тут сёлета ўжо заклалі на сянаж першы добры ўкос, нарыхтавалі нямала сена; за нарыхтоўку кармоў гаспадарку нават адзначылі ў раёне.

Працягваюць у філіяле і яго далейшае тэхнічнае аснашчэнне. А ў бліжэйшых планах — набыццё ўжо няблага вядомага сярод сельскіх працаўнікоў эфектыўнага самаходнага агрэгата (гэты агрэгат створаны не так даўно), з дапамогай якога можна апрацоўваць любыя пасевы, не наносячы ім ніякай шкоды. Гэты агрэгат лёгкі, і пасевы пасля яго праходжання ўжо хутка выпрамляюцца. Ён таксама хуткі ў рабоце, спажывае мала паліва. Яго прымяненне ў некалькі разоў таннейшае, чым, напрыклад, арэнда для адпаведных жа мэтаў сельскагаспадарчай авіяцыі. Як кажуць у гаспадарцы, у мінулым годзе самалёт над іх палямі трохі палятаў — і 12 мільёнаў выклалі.

Практычна за ўсімі набыткамі гаспадаркі, вядома ж, стаіць асноўны, мінскі, «Крыён». Але ўвесь час так працягвацца не можа. Гэта добра разумеюць у «Крыёне-Агра» і, як асабліва падкрэслівалі ў гаспадарцы, у ёй сёлета ўжо 4 месяцы плацілі заработную плату з уласна зароблених сродкаў, а не з касы рабочага «Крыёна», як раней. Цяперашняя стратэгічная мэта філіяла — выйсці на цалкам бясстратную работу, зарабляць на далейшае развіццё, на жыццё самастойна. Як падкрэслівала начальнік планава-эканамічнага аддзела Ала Якубоўская, ужо нямала чаго робіцца ў гэтым плане. А першачарговую ўвагу звярнулі на жорсткую эканомію сродкаў і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў. У прыватнасці, увялі строгія ліміты на выкарыстанне паліва і запчастак. І ўжо, напрыклад, за май на 6,6 тоны, або на 16 працэнтаў, эрасходавалі менш, чым у мінулым годзе, дызельнага паліва; на 3 тоны (на 23 працэнты) — менш бензіну. «Каб выйсці на ўстойлівa рэнтабельную работу, — падкрэсліваюць у «Крыёне-Агра», — трэба або пры тых жа выдатках, што ёсць, павялічыць вытворчасць прадукцыі, або змяншаць гэтыя выдаткі. Мы адначасова робім і адно, і другое»... Праўда, вось толькі тое ж надвор'е ўносіць гэткія істотныя карэктывы ва ўсе планы сельскіх крыёнаўцаў, а разам з тым, вядома, вымагае і дадатковых рэсурсаў ужо з боку рабочага «Крыёна». Як з жалем гаварыла галоўны аграном філіяла Алена Афанасенка, ад сёлетняй спёкі ўжо беззваротна страчана па 10—15 працэнтаў збожжавых на гектары, і цяпер у планах працаўнікоў «Крыёна-Агра» «хоць бы ўзяць леташняе». Праўда, нягледзячы на тыя ж пагодныя анамаліі, у гаспадарцы, на час яе наведвання, прывычна рабілі сваю работу: апрацоўвалі бульбу супраць жукоў, звозілі ў гумно сена і г.д. Калі не рабіць гэту работу і толькі наракаць на надвор'е, вядома ж, нічога ўвогуле не возьмеш.

***

У нашым расказе пра сённяшнія справы «Крыёна-Агра» нельга таксама абысці асобныя, так бы мовіць, казытлівыя пытанні. Першае з іх датычыцца дзяржзаказу на збожжа. Жаў, намалацію яго — пэўную колькасць прадай дзяржаве (для «Крыёна-Агра» гэта, як правіла, 600 тысяч тон). Прычым па строга вызначаных цэнах, якія часам нават не пакрываюць адпаведна зробленыя выдаткі. А так складваецца сітуацыя менавіта для «Крыёна-Агра», у якім, нагадаем, зямля мае вельмі нізкую бальнасць. Словам, сабекошт вырашчанага тут збожжа высокі. І ўраджаі не такія ўжо вялікія; у цэлым валавы збор вагаецца ў межах 3 тысяч тон. Пры гэтым гаспадарцы патрэбна болей за 2,5 тысячы тон, каб рыхтаваць камбікорм для сваёй жывёлы (а яго тут робяць самі). А яшчэ з таго небагатага ўраджаю трэба закласці каля 500 тон на насенне, у страхавы фонд і г.д. Падвядзём свайго роду вынік: прадаюць у «Крыёне-Агра» свае 600 тон, згодна з дзяржзаказам, па 160—175 тысяч рублёў за тону, а потым купляюць камбікорм, бо свайго збожжа не хапае для прыгатавання свайго ж камбікорму, па 400 тысяч рублёў за тону. Дзе тут эканамічная логіка? «Вось і зніжай пасля гэтага сабекошт сваёй прадукцыі», — падкрэсліваюць у філіяле. І, дарэчы, тут ужо надвор'е абсалютна ні пры чым, хіба што яно зробіць сёлетнія цэны на той жа камбікорм яшчэ вышэйшымі.

Наступнае пытанне — «цыбульнае». Згодна з адпаведнай праграмай, даводзяць філіялу пасевы цыбулі. Летась пасеялі 30 гектараў. Аднак пакуль знялі, пачысцілі, пасушылі — апярэдзілі працаўнікі Гомельскай вобласці, якія забілі ўсе базы ды рынкі сваёй цыбуляй, дарэчы, таксама «праграмнай» (зразумела, там можна вырасціць хутчэй). Паўгода гаравалі ў філіяле са сваім горам цыбульным, палавіну цыбулі страцілі. Палічылі «дэбіт-крэдыт» і атрымалася: выдаткавалі 52 мільёны рублёў — 20 мільёнаў заработалі.

Аднак, здавалася, сумны вопыт таксама вучыць. Тым не меней даводзяць «Крыёну-Агра» з раёна тыя ж 30 цыбульных гектараў і на гэты год. Менавіта даводзяць, хоць сёння гэта і некалькі дзіўна гучыць. Праграма ж! Праўда, разам з тым абяцаюць дапамагчы са збытам. Аднак як бы ні ўліпнуць «Крыёну-Агра» са сваёй цыбуляй зноў.

І ўсё ж варта закончыць на больш аптымістычнай ноце. Як сказана ўжо, пры новых гаспадарах многае змянілася ў былым СВК да лепшага. Нам жа больш бачыцца тое, што новыя гаспадары могуць цяпер лепей за таго ж селяніна, за сябе пастаяць. Як у раёне, якому, нягледзячы на вышэйсказанае, ужо значна цяжэй абгрунтоўваць свае асобныя «дырэктывы», так і ў адносінах з партнёрамі. Скажам, такі прыклад: мелі неасцярожнасць у «Крыёне-Агра» купіць цуда-сеялку, якую склапалі на Брэсцкім электрамеханічным заводзе і якая ніводнага разу так і не змагла прайсці па полі. Словам, аказалася недзеяздольнай. Яўна маглі б брэсцкія «ўмельцы» са сваімі юрыстамі, маркетынгам і г.д. адбіцца ад гэтага свайго цуда-экзэмпляра раней, пры СВК, а тут давялося забіраць ды вяртаць грошы. Карацей кажучы, на іх юрыстаў знайшоўся крыёнаўскі юрысконсульт — Генадзь Ігнацьеў...

Так і далей трымаць, працаўнікі «Крыёна-Агра». Уменне адстойваць сваю праўду і свае інтарэсы ў нашым жыцці таксама нямала значыць.

P.S. Аднак, здаецца, нарэшце пайшлі дажджы і, няйначай, трохі зменшылася трывога ў працаўнікоў «Крыёна-Агра», працаўнікоў многіх іншых гаспадарак. Але хіба толькі трохі.

Іван БАРАНОЎСКІ.

На здымках:

1. Галоўны аграном **Алёна АФАНАСЕНКА** на бульбяных палетках гаспадаркі.

2. Загадчык фермы **Міхаіл МАКАРЭВІЧ**.

3. Свінарка **Святлана Малашка** і ветурач **Святлана САЛАЎЁВА.**

4. Свінарка **Зінаіда МАМАТ**, якая якраз накіроўваецца з дома на работу.

5. Летнія пейзажы «Крыёна-Агра».

6. «Штаб» гаспадаркі.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА III КВАРТАЛ 2007 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

НАШЫМ ЧАРНОБЫЛЮ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
СВАЯ СПРАВА — БІЗНЕС, ЭКАНОМІКА, ФІНАНСЫ
Наш культурны асяродак ЖЫРАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8200 рублёў на месяц 24600 рублёў на квартал 49200 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	7850 рублёў на месяц 23550 рублёў на квартал 47100 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	13000 рублёў на месяц 39000 рублёў на квартал 78000 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	11850 рублёў на месяц 35550 рублёў на квартал 71100 рублёў на паўгоддзе

Чытач — газета

УЗАЕМНАСЦЬ І ПАСТАЯНСТВА

У мінулым годзе давялося пабываць у в. Ліпск Ганцавіцкага раёна і разыграць сярод падпісчыкаў нашай газеты некалькі прызоў. Менавіта там аказалася найбольш прыхільнікаў «Звязды» ў раёне.

І вось я зноў у Ліпску, але на гэты раз ужо ў Ляхавіцкім раёне. Менавіта ў гэтай вёсцы працуюць паштальёны, у якіх найбольш падпісчыкаў нашай газеты. Ганна Буйкевіч і Таццяна Невяроўская ўжо не адзін год адданыя «Звяздзе» і за кожнага падпісчыка яны змагаюцца. А газета адказвае ім узаемнасцю. Ужо неаднаразова паштальёнам уручаліся граматы і грашовыя прэміі. І на гэты раз ім дасталіся невялікія прэзенты з юбілейнымі лагатыпамі «Звязды». Ды не толькі ў Ліпску, але і на Ляхаўшчыне ў цэлым самая высокая падпіска на «Звязду» па Брэсцкай вобласці. І будзем спадзявацца, што так будзе і надалей.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

На здымку: (злева направа) Ганна БУЙКЕВІЧ, начальнік пошты в. Ліпск Ірына ДЫДЫШКА, Таццяна НЕВЯРОЎСКАЯ.

ФАЎНА БЕЛАРУСІ

19 чэрвеня 2007 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь увяла ў паштовае абарачэнне дзесяты выпуск стандартных марак «Фаўна Беларусі», падрыхтаваны выдавецтэнтрам «Марка» РУП «Белпошта». Мастакі Ігар Бубен і Іван Лукін.

У суд Лідскага раёна Гродзенскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **ХАРЫТОНКІНА Сяргея Аляксеевіча**, 26 ліпеня 1963 года нараджэння, ураджэнца г. Сасова Разанскай вобласці Расійскай Федэрацыі, які пражываў у г. Лідзе, па вул. Рыбіноўскага, д. 64, корпус 1, кв. 80.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якім што-небудзь вядома пра С.А. Харытонкіна, паведаміць аб гэтым суду Лідскага раёна Гродзенскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Інфарм-укол

Вада-кісларод і золата-вада

